Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 САКАВІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 43 (27901) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Адна картка – рызыкоўна?

СТАР. 4



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Карупцыянеры 300-гадовай даўнасці

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**106-107 хлопчыкаў на 100 дзяўчынак**

*нараджаецца ў Беларусі ў апошнія гады, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Да 30-гадовага ўзросту жаночая частка насельніцтва краіны знаходзіцца ў меншасці (колькасць мужчын перавышае колькасць жанчын). Уплыў міграцыйных працэсаў, больш высокая смяротнасць мужчын прыводзяць да таго, што прыкладна з 31-гадовага ўзросту жанчыны перавышаюць па колькасці мужчын. У сярэднім па рэспубліцы на 1000 мужчын прыпадае 1150 жанчын, у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу — 1167 жанчын, у сельскіх населеных пунктах — 1095 жанчын. Па папярэдніх звестках, на 1 студзеня колькасць жанчын у краіне склала 5 млн 72 тыс. чалавек (53,5% насельніцтва). У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу пражывае 77,8% жанчын, у сельскіх населеных пунктах — 22,2%.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.03.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15020,00 | ▼ |
| Еўра | 16600,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 243,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 653,04 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Вясновыя вынікі

## ПРЫГОЖЫЯ СПРАВЫ ЖАНЧЫН

**На прэс-канферэнцыі, прысвечанай 8 Сакавіка, Беларускі саюз жанчын традыцыйна падвёў вынікі сваёй працы за год.**

— Прыемна адзначыць, што мы арганізацыйна ўмацаваліся, — сказала **сустаршыня Беларускага саюза жанчын Антаніна МОРАВА**. — Сёння мы будуем сваю працу не толькі па тэрытарыяльным прынцыпе, але і па галіновым.

Цяпер у складзе БСЖ тры самастойныя арганізацыі: АСБ Беларусбанк, жаночая арганізацыя БДУ, актыўная арганізацыя «Сяльчанка», а таксама чатыры клубы: «Клуб дзелавых жанчын», «Клуб жанчын-вучоных», «Спадарыня» для творчых жанчын і «Крэда» для жанчын-медыкаў.

Як і раней, жанчыны Беларусі актыўна прымаюць удзел у рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці», падчас якой наведваюць прыёмныя і шматдзетныя сем'і, дзіцячыя дамы, акцыі «Здароўе жанчын — здароўе нацыі», прысвечанай Чарнобыльскай трагедыі, калі разам з медыкамі выязджаюць у аддаленыя Чарнобыльскія раёны, дзе праводзяць абследаванне насельніцтва і сустрэчы.

Таксама БСЖ правеў акцыю да Дня маці, падчас якой па віншаванні з розных абласцей краіны ў Мінск прыязджалі жанчыны і дзеці з абмежаванымі магчымасцямі. З'явілася і новая — сумесная з ХоумБанкам — акцыя, прысвечаная таленавітай моладзі: дзеці з малазабяспечаных і няпоўных сем'яў атрымалі 5 стыпендый. Было праведзена некалькі конкурсаў: «Жанчына года», «Сям'я года», «Моцная сям'я — моцная дзяржава» (з Міністэрствам інфармацыі), «Любоў да Айчыны праз любоў да свайго роду» (з часопісам «Алеся»), для старшакласнікаў «За што я люблю сваю вёску» і «Сям'я — служым разам» (з Міністэрствам унутраных спраў).

— Сёлета мы працягнем традыцыйныя акцыі і конкурсы, — дадала Антаніна Морава. — У Беларусі аб'яўлены Год моладзі, таму ў нашых мерапрыемствах гэта тэма будзе прысутнічаць абавязкова. Безумоўна, з 70-годдзем Вялікай Перамогі павіншуем нашых ветэранаў.

Карыстаючыся магчымасцю, Антаніна Морава ад імя БСЖ павіншавала ўсіх жанчын Беларусі са святам і пажадала ім сонечнага надвор'я.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ**

■ Надвор'е

## НА СВЯТА — ДА 12 ЦЯПЛА

**Сёння** будзе воблачна з праясненнямі. Месцамі кароткачасовыя ападкі (у асноўным мокры снег). Уначы і раніцай у асобных раёнах — слабы туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Вецер пераменных напрамкаў, слабы да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да мінус 5 градусаў, максімальная ўдзень — плюс 1-6 градусаў. Атмасферны ціск будзе слаба расці. Пра гэта паведамляюць сіноптыкі Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды.

**У суботу** месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж), чакаецца слабы туман, уначы і раніцай — слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад 0 да 5 марозу, а пры праясненнях — нават да мінус 7 градусаў, удзень — 2-8 цяпла.

**8 сакавіка** месцамі, пераважна па паўночнай палове краіны, чакаюцца кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Уначы і раніцай у асобных раёнах — слабы туман, галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, удзень — 4-10 цяпла, а па захадзе краіны чакаецца нават да плюс 12 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ЗАХАВАЦЬ КРАІНУ І ПРАВАПАРАДАК

## Войны і канфлікты, якія адбываюцца ў свеце, не павінны перасягнуць нашу мяжу

**Аб гэтым на сустрэчы з кіруючым саставам органаў унутраных спраў, унутраных войскаў МУС і курсантамі факультэта унутраных войскаў Ваеннай акадэміі заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамляе БЕЛТА.**

«Нельга не ўлічваць, што сучасны свет імкліва змяняецца, становячыся ўсё менш бяспечным для жыцця людзей, а шэраг дзяржаў апусціўся ў бездань грамадзянскіх войнаў і міжнацыянальных канфліктаў. І гэтыя з'явы ўжо ўшчыльную падышлі да нашых межаў», — канстатаваў беларускі лідар.

Прэзідэнт адзначыў, што ў сучасных умовах існуе пагроза экспарту ў Беларусь нацыяналістычных і радыкальных ідэй і дактрын. «У гэтых умовах пры захаванні і ўзмацненні рэальных і патэнцыяльных пагроз нацыянальнай бяспецы Беларусі мы павінны прымаць усе меры, каб забяспечыць сваю незалежнасць і сваю дастойную будучыню, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Менавіта гэта настойліва патрабуе падтрымання на высокім узроўні абараназдольнасці краіны, абароны яе тэрытарыяльнай цэласнасці і канстытуцыйнага ладу. Сілавыя структуры з'яўляюцца важным фактарам нашай нацыянальнай бяспекі, міру і спакою ў дзяржаве. Таму мы надаём асаблівую ўвагу сучаснаму стану і перспектывам развіцця ўсяго нашага сілавога блока».

«У нашай краіне, на шчасце, захаваны мір і згода, няма канфліктаў на нацыянальнай і рэлігійнай глебе. Беларускі народ за сваю гісторыю спаўна пазнаў трагедыю войнаў, што прайшлі па нашай зямлі. І мы нікому не жадаем зведаць жахі ваеннага часу», — адзначыў Прэзідэнт.

«Я ўжо неаднаразова гаварыў, але лічу неабходным яшчэ раз падкрэсліць: ніякім «плошчам» у Беларусі не бываць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Правапарадак, як і сваю краіну, мы павінны поўнасцю захаваць».

Роля Беларусі ў сістэме агульнаеўрапейскай бяспекі важная, і гэта ў апошні час усвядоміў і Захад. «Яны (прадстаўнікі краін Захаду. — **Заўвага БЕЛТА**) прыязджаюць да нас з вельмі прагматычнай мэтай. І я іх у гэтых адносінах падтрымліваю. Яны цяпер зразумелі, што такое бяспека ў Еўропе, якую ролю Беларусь можа адыграць у гэтай сістэме бяспекі ў нашым агульнаеўрапейскім доме. Гэта еўрапейцы разумеюць, і яны гатовы з намі супрацоўнічаць, у тым ліку і ў імя бяспекі ў Еўропе. Мы ім гаворым, што заўсёды для гэтага адкрыты», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Сёння ёсць надзея, што сусветная супольнасць на аснове мінскіх пагадненняў па ўрэгуляванні ўкраінскага крызісу прыкладзе намаганні для спынення братазабойчай вайны. Гэта трэба ў першую чаргу ўкраінскаму народу, гэта трэба Еўрапейскаму саюзу, і Беларусі, і Расіі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Акцэнтаваў увагу Прэзідэнт і на пытаннях міграцыйнай палітыкі: «Падзеі, якія адбываюцца ў нашага пайдзёвага суседа, прадвызначылі неабходнасць аператыўнага прыняцця рашэнняў у галіне міграцыйнай палітыкі. — Задача ў тым, каб не дапусціць пранікнення да нас баевікоў і злачынных элементаў, але ў той жа час паважліва прымаць тых, хто едзе да нас з адкрытым сэрцам і добрымі намерамі».

Прэзідэнт падкрэсліў, што галоўная задача, якая стаіць сёння перад урадам і ўсімі органамі ўлады, — уздым эканомікі. Эканамічная слабасць ператварае нацыю ў заложніцу міжнародных фінансавых арганізацый. Гэта адбываецца, калі бюджэтныя рэсурсы краіны не дазваляюць ёй эфектыўна функцыянаваць, выконваць у поўнай меры сацыяльныя абавязацельствы.

Гаворачы пра дзейнасць работнікаў праваахоўных органаў, кіраўнік дзяржавы заявіў, што ў Беларусі ўдалося дабіцца станоўчых зрухаў у спыненні адной з найбольш небяспечных праяў злачыннасці — карупцыі. «Гідру гэту (карупцыю. — **Заўвага БЕЛТА**) перамагчы вельмі складана, але трымаць яе на мінімальным узроўні мы заўсёды зможам», — сказаў беларускі лідар, дадаўшы, што ў гэтым немалая заслуга органаў унутраных спраў. Ёсць і шэраг іншых момантаў, якія сведчаць аб умацаванні правапарадку: самыя неабароненыя жыхары краіны — людзі пажылога ўзросту — усё радзей фігуруюць у зводках як ахвяры злачынстваў.

Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу МУС на неабходнасць узмацнення барацьбы са злачыннасцю і яе прафілактыкі ў сельскай мясцовасці. «Распаўсюджанасць п'янства і алкагалізацыя асобных слаёў насельніцтва застаецца адной з умоў ускладнення крыміналагеннай абстаноўкі ў сферы сямейна-бытавых адносін, якая характарызуецца ўзрослай цяжкасцю ўчыненых дзеянняў. У мінулым годзе больш як на чвэрць павялічылася колькасць забойстваў, учыненых у быце», — адзначыў Прэзідэнт.

На яго думку, з поля зроку органаў правапарадку фактычна выпала сітуацыя, якая складваецца ў сельскай мясцовасці, дзе ўзровень асаблівa цяжкіх і цяжкіх злачынстваў у сферы бытавых адносін у два разы вышэйшы, чым у гарадах. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў больш зладжанай работы ўчастковых у барацьбе са злачыннасцю.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на актывізацыю проціпраўных памкненняў асобных маладзёжных аб'яднанняў, у прыватнасці футбольных фанатаў. «Спакой у краіне — гэта галоўнае», — падкрэсліў ён.

На думку кіраўніка дзяржавы, нядобранадзейнасць у сем'ях у многім стымулюе проціпраўныя паводзіны падлеткаў. Нягледзячы на прымаемыя мэтанакіраваныя меры, у рэспубліцы амаль у тры разы павялічылася колькасць злачынстваў, учыненых падлеткамі пад уздзеяннем наркотыкаў. «Тут павінны быць сур'ёзныя, жорсткія дзеянні. Міністр задачу атрымаў, яна павінна быць выканана», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што лічыць недапушчальным для работнікаў органаў унутраных спраў праяўленне пагарды і высакамернасці. На яго думку, асаблівую ўвагу трэба надаць выкараненню негатыўных праяў, якія дыскрэдытуюць органы унутраных спраў у вачах грамадскасці.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што надзённай задачай унутраных войскаў з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці і выніковасці выканання службова-баявых задач. «Кожны ваеннаслужачы павінен ведаць і разумець, што на яго баку закон, што ён абаронены дзяржавай. Унутраныя войскі, як і ўсе Узброеныя Сілы, — гэта школа патрыятычнага выхавання маладых людзей. Упэўнены, што словы «абавязак», «гонар», «Айчына» для кожнага, хто прайшоў службу ва ўнутраных войсках, будуць арыенцірамі, якія вызначаюць іх справы і ўчынкі ў грамадзянскім жыцці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

■ Бізнес і ўлада

# АД ПРАЕКТАЎ ДА ДЗЕЯННЯЎ

**Інструменты ўзаемадзеяння ўлады і бізнесу, удасканаленне падатковай палітыкі, інвестыцыйныя фактары, гэтыя і многія іншыя пытанні абмяркоўваліся на XVI асамблеі дзелавых колаў Беларусі.**

Усе ўдзельнікі, а гэта былі як прадстаўнікі міністэрстваў, так і прадпрымальнікі, прыйшлі да адзінага меркавання, што ва ўмовах звужэння знешніх рынкаў трэба распрацаваць найбольш эфектыўную стратэгію для ўзаемавыгаднага ўзаемадзеяння. Індывідуальныя прадпрымальнікі — адны з найважнейшых падаткаплацельшчыкаў для краіны, гэта той фундамент, які дазволіць выстаяць нават у самых неспрыяльных эканамічных умовах. Аднак сёння бізнес у Беларусі, на думку прадпрымальнікаў, знаходзіцца не ў найлепшых умовах.

## ПРАПАНОЎВАЦЬ СТРАТЭГІІ АДЗІН АДНАМУ

Урад і бізнесмены пастаянна спрабуюць знайсці агульныя падыходы. Як адзначыў **старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір КАРАГІН**, найбольш ахвотна з прадпрымальнікамі супрацоўнічаюць Міністэрства эканомікі, Міністэрства гандлю, Міністэрства па падатках і зборах. Яны праяўляюць ініцыятыву і абмяркоўваюць прапановы. Адносна іншых галіновых міністэрстваў, такіх як Мінпрам, лёд яшчэ не скрануўся. Для таго, каб паскорыць узаемадзеянне ўлады з бізнесам, прадпрымальнікі распрацавалі праект «Нацыянальнай платформы бізнесу Беларусі — 2015».

«Як ніколі раней бізнес-асацыяцыі працавалі над платформай. Тут 85 пунктаў, сфармуляваных самім бізнесам, і 28 пунктаў таго, як бізнесмены бачаць яе рэалізацыю. У дадзены момант (да 15 сакавіка) платформа рэдагуецца, і ва ўсіх ахвотных ёсць магчымасць унесці свае прапановы. Далей дакумент будзе прадстаўлены ўраду», — падкрэсліў Уладзімір Карагін.

**Намеснік міністра эканомікі Ірына КАСЦЕВІЧ**, якая прысутнічала на асамблеі, у сваю чаргу адзначыла, што Міністэрства эканомікі ўжо працуе над стратэгіяй развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

«Гэта сярэднетэрміновая праграма, якая распрацоўваецца з падтрымкай Сусветнага банка, яна возьме найлепшы сусветны вопыт, які сёння ёсць», — адзначыла Ірына Касцевіч.

Паводле яе слоў, дакумент стане паслядоўным этапам лібералізацыі эканамічных працэсаў, якія адбываюцца ў краіне. Стратэгія павінна стаць дарожнай картай праграмы развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва да 2018 года. У дакуменце замацуюцца канкрэтныя мерапрыемствы па ўдзеле прадпрымальніцтва, бізнесу ў рэгіянальных, галіновых праграмах эканамічнага развіцця. Пры гэтым намеснік міністра падкрэсліла, што прадпрымальнікаў запрашаюцца да абмеркавання ўсіх праектаў дакументаў як кароткатэрміновага, так і сярэднетэрміновага і доўгатэрміновага планавання.

«У найбліжэйшы час яны будуць размешчаны на сайце Мінэканомікі. Мы заклікаем уважліва вывучыць гэтыя дакументы і ўносіць прапановы, якія мы не пакінем без увагі», — дадала Ірына Касцевіч.

## ІНДЭКС ДЗЕЛАВОГА АПТЫМІЗМУ АБО ПЕСІМІЗМУ?

Індэкс дзелавога аптымізму бізнес-супольнасць вымярае ў сёмы раз. Такія індэксы рэгулярна публікуюцца ў ЗША, Вялікабрытаніі і Германіі, дзе адпаведныя сацыялагічныя вымярэнні праводзяцца нацыянальнымі бізнес-асацыяцыямі. Індэкс дзелавога аптымізму можа паведамляць аб магчымым эканамічным спадзе, а рост яго паказчыкаў здольны падняць давер да нацыянальнай эканомікі, у тым ліку паўплываць на ўмацаванне курса нацыянальнай валюты.

Цяпер у апытанні ўдзельнічалі 518 уладальнікаў як малога, так і вялікага бізнесу. Па пытанні «як змяніўся стан беларускай эканомікі за апошнія паўгода» 95,5% рэспандэнтаў адзначылі пагаршэнне. На тое, як змяніўся стан бізнесу апытаных, 82% адказалі, што пагоршыўся. На тое, як зменіцца стан беларускай эканомікі ў найбліжэйшыя паўгода — толькі 1,9% рэспандэнтаў адзначылі, што палепшыцца. Як жа зменіцца стан вашага бізнесу ў будучыя паўгода? Толькі 7,3% апытаных мяркуюць, што палепшыцца.

Акрамя стандартных пытанняў, якія ў сёмы раз задаваліся суб'ектам гаспадарання, іх таксама папрасілі назваць асноўныя праблемы беларускага бізнесу. На першым месцы апынуўся доступ да фінансавых рэсурсаў — 70,1%, на другім — нестабільнае заканадаўства — (55,8%), трэцяе месца — неплацяжы — (52,2%), далей рост выдаткаў (арэнда, падаткі) — 42%, дзяржаўная манаполія — 41%, немагчымасць планавання і нестабільнасць эканамічнай сітуацыі — 38,4%.

У выніку індэкс сёмага этапу вымярэння зваліўся ў шкале песімізму да 0,08%. Найбольш нізкі індэкс дзелавога аптымізму адзначаецца ў Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Знешняя палітыка

## ПРЫЕДЗЕ МІНІСТР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ КНДР

На наступным тыдні нашу краіну з афіцыйным візітам наведаюць міністр замежных спраў Карэйскай народна-дэмакратычнай рэспублікі Лі Су Ён. Пра гэта на брыфінгу паведаміў **Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў.**

Падчас візіту адбудуцца перамовы міністра замежных спраў Уладзіміра Макея з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства КНДР, у дэлегацыі запланавана сустрэча і ва ўрадзе Беларусі.

— Плануецца, што бакі абмяркуюць увесь спектр двухбаковых беларуска-паўночнакарэйскіх адносін, уключаючы пытанні палітычнага дыялогу, двухбаковае ўзаемадзеянне ў гандлёва-эканамічнай сферы, у галіне адукацыі і аховы здароўя, — праінфармаваў прэс-сакратар МЗС. — Праграмай візіту прадугледжваецца наведванне Лі Су Ёнам беларускіх прамысловых прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама культурна-гістарычных аб'ектаў Мінска і Мінскай вобласці.

Як дадаткова паведаміў Дзмітрый Міронч ык, Беларусь і КНДР устанавілі дыпламатычныя стасункі ў пачатку 90-х гадоў, калі было падпісана адпаведнае сумеснае камюніке. У чэрвені 2014 года ў Мінск быў прызначаны Пасол КНДР, які сумяшчае гэту пасаду з пасадай Пасла КНДР у Расійскай Федэрацыі. Пакуль што ён не ўручыў даверчыя лісты кіраўніку нашай дзяржавы.

## НАШ ІНТАРЭС У КЛАЙПЕДЗЕ

Учора пачаўся візіт намесніка міністра замежных спраў нашай краіны Аляксандра Гур'янава ў Літву. У яго рамках пройдуць перамовы з віцэ-міністрам замежных спраў Літвы Раландасам Крышчунасам па пытаннях эканамічнага ўзаемадзеяння.

Сёння Аляксандр Гур'янаў наведвае Клайпеду для правядзення сустрэч з кіраўніцтвам Клайпедскага марскога порта і тэрміналаў па перавалцы грузаў. У гэты ж дзень мяркуецца ўдзел намесніка кіраўніка МЗС Беларусі ў цырымоніі адкрыцця ў Клайпедзе першага ў Літве ганаровага консульства Рэспублікі Беларусь.

Дзмітрый Міронч ык расказаў, што яго кіраўніком стане літоўскі грамадзянін беларускага паходжання Мікалай Логвін. Ён працуе ў якасці незалежнага эксперта кампаніі «Караблі і людзі», а таксама актыўна ўдзельнічае ў беларуска-літоўскім узаемадзеянні ў сферы эканомікі.

## СПРАВА НЕ АДНАГО ГОДА

Каментуючы пытанне наконт перспектыў больш глыбокага ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і Расіяй у сферы візавай палітыкі, Дзмітрый Міронч ык падкрэсліў: выхад на больш глыбокае ўзаемадзеянне — гэта комплекснае, складанае пытанне.

— Асабліва з улікам несупадаючых візавых рэжымаў з трэцімі краінамі. Перспектыва іх збліжэння — справа не аднаго дня і, магчыма, нават не аднаго года, якая патрабуе ўключэння і абавязкова зацікаўленага ўдзелу нашых замежных партнёраў, — патлумачыў Дзмітрый Міронч ык.

Па яго словах, візавая палітыка рэгулюе не толькі рэжым доступу замежных грамадзян на тэрыторыю Беларусі.

— З яе дапамогай на аснове ўзаемнасці беларускі бок імкнецца максімальна палегчыць паездкі грамадзян Беларусі за мяжу. Таму, карэктуючы нашу візавую палітыку, збліжаючы яе з палітыкай расійскіх партнёраў, мы павінны быць упэўнены, што рэжым паездак нашых грамадзян павінен у выніку не толькі не пагоршыцца, але і, што важна, мець рэальныя перспектывы паляпшэння шляхам спрашчэння візавых працэдур або поўнай адмены віз.

Ён дадаў, што таксама важным аспектам з'яўляецца эканамічны бок пытання. Няхай ён і не таго маштабу, як, напрыклад, размеркаванне мытных пошлін у ЕАЭС. Але такія пытанні таксама трэба ўрэгуляваць, калі беларускі і расійскі бакі знойдуць варыянты сумесных дзеянняў у гэтым кірунку.

## ВІЗІТ ДЗЯРЖСАКРАТАРА ВАТЫКАНА

12-15 сакавіка 2015 года па запрашэнні беларускага боку Рэспубліку Беларусь з афіцыйным візітам наведае Дзяржаўны сакратар Ватыкана П'етра Паралін.

Візіт рэалізуецца для развіцця дамоўленасцей са Святым Прастолам, дасягнутых у рамках работы па пашырэнні міждзяржаўных беларуска-ватыканскіх адносінаў.

Адбудуцца перамовы паміж міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем і Дзяржаўным сакратаром Ватыкана. Праграмай візіту таксама прадугледжаны правядзенне шэрагу сустрэч з беларускімі афіцыйнымі асобамі, кіраўніцтвам Каталіцкай і Праваслаўнай царквы, удзел у закладцы памятнай капсулы на месцы будаўніцтва новага будынка дыпрадстаўніцтва Ватыкана — Апостальскай нунцыятуры.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

# ПРАЎДУ ПРА ВАЙНУ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ УСЕ

**Інфармацыйнае суправаджэнне мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю Вялікай Перамогі, стала ўчора павесткай дня калегіі Міністэрства інфармацыі. Як падкрэслілі амаль усе выступоўцы, асабліва важна, каб грамадзяне нашай краіны ведалі праўду пра тыя страшныя гады.**

Удзельнікі калегіі перад пачаткам мерапрыемства атрымалі сімвал акцыі «Кветкі Перамогі», ініцыяванай Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі, — кветку яблыні на фоне чырвона-зялёнай стужкі. **Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** прызвала падтрымаць гэту акцыю.

— Усе мы ведаем, што беларускі народ заплаціў дарагую цану за тое, каб перамога ўсталявалася ва ўсім свеце, — заўважыла падчас адкрыцця калегіі міністр інфармацыі. — Менавіта на беларускай зямлі варожыя войскі адчулі ўсю сілу супраціўлення і менавіта тут ва ўпартасці нашых бацькоў і дзядоў, у іх герaічнай мужнасці нараджалася надзея і вера ў перамогу. Мы ведаем, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны слова не змаўкала. Перыядычны друк, кнігі выдаваліся ў партызанскіх атрадах — гэта была вялікая праца: слова клікала на барацьбу з фашызмам, вучыла дзяцей грамаце ў партызанскіх атрадах...

Міністр інфармацыі звярнула асаблівую ўвагу на тое, што сёння, калі, на вялікі жаль, далёка не ў кожнай сям'і засталіся сведкі ваенных гадоў, вельмі важна сфарміраваць у людзей правільнае стаўленне да тых падзей.

— Мы павінны асаблівую ўвагу надзяліць фарміраванню праўды пра вайну, — заявіла Лілія Ананіч.

У сваю чаргу **Уладзімір МАТУСЕВІЧ, намеснік міністра інфармацыі**, заўважыў, што сёлета ў працы айчынных СМІ тэма 70-годдзя Вялікай Перамогі з'яўляецца дамінантнай. Асаблівае месца ў друку займаюць успаміны ўдзельнікаў вайны, нарысы пра ветэранаў, гістарычныя падзеі 1941-1945 гадоў.

— Ва ўсіх вядучых рэспубліканскіх газетах створаны адпаведныя тэматычныя рубрыкі, старонкі. Найважнейшым момантам сённяшняй інфармацыйна-ідэалагічнай работы з'яўляецца захаванне гістарычнай праўды, недапушчэнне фальсіфікацый у нашай вялікай гісторыі. У нашым друку — у газетах «СБ. Беларусь сегодня», «Звязда» толькі ў гэтым годзе выйшаў шэраг такіх публікацый.

Сярод іх намеснік міністра назваў матэрыял Аляксандра Шпакоўскага «Хлусня гістарычных рэвізіяністаў», надрукаваны ў газеце «Звязда».

Выступоўцы выказвалі розныя меркаванні наконт таго, як лепш арганізаваць працу СМІ, каб грамадзяне нашай краіны атрымалі поўную інфармацыю пра ваенныя гады.

**Павел ЯКУБОВІЧ, галоўны рэдактар газеты «СБ. Беларусь сегодня»**, паставіў філасофскае пытанне: а чаму гісторыя вайны не стала часткай ментальнасці беларусаў яшчэ ў савецкія гады?

— Мне ўспамінаюцца нашы дыскусіі з Віталем Скалабанам, архівістам, які меў якасці і гісторыка, і літаратара, і даследчыка. Ён задаваўся пытаннем: чаго не хапіла ў эпоху Машэрава, каб зрабіць гісторыю партызанскага руху, гісторыю вайны часткай ментальнасці беларусаў? Ці мы «перакармілі» аўдыторыю, ці перайшлі на штампы і наступныя пакаленні сталі адносіцца да памяці партызанскага руху вельмі стрымана? Думаю, што за гутаркамі на старонках газет аб ваенных подзвігах, славе ў такім жа маштабе трэба казаць і пра ахвярнасць, пра тое, што адбывалася на тэрыторыі Беларусі, як пакутавала насельніцтва краіны для таго. Гэта неабходна, каб выклікаць у людзей адчуванне дачынення.

Адным са спосабаў рэалізаваць гэта Павел Якубовіч назваў асвятленне невядомых шырокай аўдыторыі фактаў ваеннай гісторыі.

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ** пасля выступленняў расставіў акцэнты наконт таго, што не павінны ўпусціць СМІ, працуючы з тэмай Вялікай Перамогі.

— Перамогу мы павінны ўсведамляць і ўспрымаць гэтак жа, як яна ўсведамлялася 70 гадоў таму, і з тым жа эмацыянальным пасылам, — падкрэсліў Ігар Бузоўскі. — Гэта было адстойванне свабоды, адстойванне права быць чалавекам. Фактычна сёння мы адстойваем тую ж перамогу. Мы можам гэта па-рознаму падаваць, але ва ўсіх мерапрыемствах павінна быць закладзена: перамога — гэта незалежнасць. Магчыма, неабходна пераглядзець некаторыя гістарычныя факты. Але рабіць гэта трэба выключна ў мэтах захавання бяспекі краіны, захавання той ідэі, якую закладвалі нашы дзяды.

Па словах Ігара Бузоўскага, у юбілейны год Вялікай Перамогі важна стварыць такія матэрыялы ў сродках масавай інфармацыі, у інтэрнэт-прасторы, якія б, расказваючы пра Вялікую Айчынную вайну, западалі ў душы, розумы маладых грамадзян.

— Неабходна рыхтаваць публікацыі, якія расказвалі б пра падзеі мінулага нефармальна, — заявіў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — У сродках масавай інфармацыі ёсць нямала цікавых праектаў на тэму Вялікай Айчыннай вайны і Вялікай Перамогі. Важна прааналізаваць змест рубрык. І, не распыляючыся, раскрываць тэмы поўна, аб'ёмна, каб дастукацца да моладзі.

Сваімі развагамі пра героіка-патрыятычную тэматыку ў айчынных мас-медыя, пра кніжныя праекты, скіраваныя на выхаванне ў грамадстве паважлівага стаўлення да Вялікай Айчыннай вайны падзяліліся старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч.


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Блізкая ўлада

# У чарзе на права паскардзіцца

**Ужо традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі па суботах папулярнасці не страчваюць. Праўда, у адрозненне ад аблвыканкамаў, куды адразу паступае ў сярэднім па 30-40 пытанняў, райвыканкамы абмяжоўваюцца 3-4. Таму для Чавусаў 14 званкоў запар, якія прыняў намеснік старшыні раённай улады па жыллёва-камунальных пытаннях Генадзь ВАСІЛЕЎСКІ, — своеасаблівы рэкорд.**

— У мясцовай газеце кожны тыдзень даецца інфармацыя наконт чарговай прамой лініі, а таксама прозвішча і пасада той асобы, якая будзе яе праводзіць. Вось людзі і рэагуюць, — тлумачыць гэты ўсплёск **начальнік аддзела па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб Чавускага райвыканкама Аляксандр ФЯЦІСАЎ.**

Наогул з пачатку правядзення прамых ліній (з 17 студзеня) у Чавускі выканкам звярнуліся 24 чалавекі. Пытанні ўзнікалі ў асноўным у жыхароў самога райцэнтра, а таксама Гарбавіцкага і Антонаўскага сельсаветаў. Заяўнікі з аграгарадка Антонаўка пацікавіліся, калі скончыцца капітальны рамонт іх шматкватэрнага дома. «Гэта пытанне і раней стаяла на кантролі, і людзі, напэўна, вырашылі паскорыць працэс, — удакладніў Аляксандр Ягоравіч. — Але ёсць вызначаныя тэрміны, і яны выконваюцца». Яшчэ быў зварот, які датычыўся рамонту даху ў Чавусах. Асноўныя работы ўжо выкананы, астатнія плануецца скончыць на працягу двух месяцаў.

Некалькі жыхароў пацікавіліся наконт атрымання накіравання ў абласную бальніцу. Яшчэ двум спатрэбілася «разблакіраваць» тэлефон. Жыхары дома ў аграгарадку Гарбавічы паскардзіліся на дрэнны стан даху, па іх сігнале праведзена абследаванне і запланаваны работы. У вёсцы Сталка па просьбе насельніцтва пачысцілі калодзеж. «Усе пытанні самыя звычайныя, амаль ніводнае не мае нейкага там рэцыдыўнага характару, — адзначыў Аляксандр Фяцісаў. — Нехта патэлефанаваў, каб прынялі меры па вывазе смецця. Цікавіліся, як вырашыць пытанне па газіфікацыі. Ім растлумачылі, што трэба стварыць кааператыў ці ўступаць ва ўжо існуючы. Іх, дарэчы, у раёне больш за 20.

Між тым асноўны наплыў званкоў ад насельніцтва адчуваюць усё ж такі абласныя ўлады. Тэлефаністы адзначаюць тысячы спроб дазвонай, у той час як рэальна магчыма абслужыць толькі 35-40 чалавек. Разам з тым некаторыя ставяць тэлефоны на аўтадазвон і паспяваюць патэлефанаваць ажно двойчы. Як жыхарка з Бялынічаў, якой няма дзе працаўладкавацца. Тое, што ёй прапаноўваюць, не задавальняе, і яна працягвае вырашаць пытанне праз Магілёў. А яшчэ людзі зусім не ўлічваюць тое, хто працуе на лініі. Хаця ў паведамленнях, якія друкуюцца на сайтах і ў мясцовых СМІ, акрамя нумароў тэлефонаў, акрэсліваецца і кола пытанняў, якія курыруе той ці іншы спецыяліст.

Калі ж зрабіць рэйтынг тэлефонных зваротаў, то з іх па-ранейшаму на першым месцы камунальныя (рамонты дамоў, дарог і гэтак далей), на другім — жыллёвыя (прыватызацыя, пастаноўка на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў...), на трэцім — будаўніча-архітэктурныя (парушэнне правілаў забудовы, межаў паміж участкамі...).

**Нэлі ЗІГУЛЯ** ■

# ЯБЛЫНЕВЫ САД ПЕРАМОГІ

**У Брэсцкай крэпасці ёсць не зусім звычайны востраў Пагранічны. Яго ўтварае абводны канал, на якім праходзіць дзяржаўная мяжа. Адметнасць вострава ў тым, што многія дзесяцігоддзі ён быў закрытай тэрыторыяй пaмежнага ведамства і большасць брастаўчан лічылі яго польскім.**

Акрамя рэдкіх вартавых мяжы, туды з часоў вайны не ступала нага чалавека. І на востраве нібы спыніўся час. На гэтым лапіку зямлі можна сустрэць не толькі ўмацаванні, пабудовы XIX стагоддзя, часоў Вялікай Айчыннай, на складах дзе-нідзе засталіся нават вопратка, абутак, посуд вайскоўцаў 1941 года. На Пагранічным унікальная флора, якая захавалася ва ўмовах запаведнасці.

І толькі ў 2011 годзе было прынята рашэнне забяспечыць доступ турыстам на востраў. Першыя арганізаваныя групы трапілі на аб'ект у маі 2013 года. А цяпер з'явілася інфармацыя, што на востраве будзе яблыневы сад у гонар 70-годдзя Перамогі.

Ініцыятарамі пасадкі яблынь выступілі міліцыянеры. Справа ў тым, што ў першыя дні вайны абарону вострава Пагранічны трымалі і супрацоўнікі міліцыі — воіны 132-га асобнага батальёна НКУС, курсанты аўташколы. Іх подзвіг увекавечаны памятным знакам.

Як сказаў кіраўнік прэсслужбы Брэсцкага абласнога ўпраўлення УУС Сяргей ДУЧЭНКА, на сродкі міліцыянераў будуць закуплены саджанцы пладовых дрэў і высаджаны на адведзенай пляцоўцы.

Ініцыятыву міліцыі падтрымалі пaмежнікі, эколагі, юннаты. Навукоўцы пацвердзілі, што на месцы будучага сада не было пахаванняў, там не стаялі збудаванні. Група разміравання яшчэ раз праверыць участак на прадмет яго бяспекі, і 22 красавіка запланавана закладка саду.

Неўзабаве 70 яблынь зашумяць у гонар Вялікай Перамогі. Даглядаць сад абяцаюць міліцыянеры. А наталяцца яблыкамі змогуць усе ахвотныя, найперш турысты, якія будуць наведваць Пагранічны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Падзея

# СОНЦА ЗНІКНЕ НА 70%

## Сёлета жыхары нашай краіны ўбачаць самае вялікае сонечнае зацьменне за апошнія 16 гадоў

**Гэтая цікавая падзея адбудзецца 20 сакавіка, праўда, сёлета чакаецца толькі частковае зацьменне нашага свяціла. Увогуле сонца будзе схавана максімум на 70%, а ўбачыць рэдкую астранамічную з'яву магчыма будзе на працягу каля 2 хвілін 50 секундаў з пачаткам зацьмення ў 13 гадзін 6 хвілін па мясцовым часе. У гэты дзень месяц праходзіць прама перад сонцам і адкідвае цень на зямлю.**



Сусветныя інфармацыйныя агенцтвы паведамляюць, што жыхарам шэрагу скандынаўскіх краін і Вялікабрытаніі, а таксама паўночных рэгіёнаў Расіі пашанцуе ўбачыць у гэты дзень поўнае сонечнае зацьменне. У цэнтральнай частцы лініі поўнага сонечнага зацьмення на гэты раз апынецца невялікі расійскі горад Баранцбург, што абяцае ператварыць горад 20 сакавіка ў месца паломніцтва ўсіх аматараў астраноміі. Баранцбург — мястэчка шахцёраў. На адарванай ад свету тэрыторыі пабудаваны чатырохпавярховыя дамы, спарткомплекс з басейнам, кінатэатр, музей «Памор'е», кавярня, гасцініца, навуковы гарадок і нават консульства Расійскай Федэрацыі. Турысты загадзя забраніравалі ўсе месцы. Поўнае зацьменне чакаецца там у 10.09 раніцы па сусветным часе.

Незвычайнасць будучай кароткачасовай імпрэзы ў тым, што гэтую з'яву можна будзе назіраць нават на Паўночным полюсе планеты. Акрамя таго, падчас поўнага сонечнага зацьмення зямляне змогуць няўзброеным вокам убачыць Венеру. Навукоўцы адзначаюць, што такая з'ява ў наступны раз адбудзецца толькі ў 2033 годзе. Яшчэ адзін дзіўны факт: зацьменне ў дзень веснавога раўнадзенства здаралася ўсяго толькі каля дзясятка разоў за ўсю гісторыю чалавецтва.

Асобныя «шэрыя» эксперты прадказваюць, што сёлета сонечнае зацьменне можа выклікаць часовае адключэнне электрычнасці па ўсёй Еўропе.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

# Кляшчы прачнуліся

**Чатыры чалавекі ў раёнах Брэсцкай вобласці звярнуліся ў медыцынскія ўстановы ў гэтым годзе пасля ўкусаў кляшчоў.**

Першы выпадак быў зафіксаваны ў Брэсце яшчэ ў студзені, астатнія тры ў лютым, — паведаміла карэспандэнту газеты супрацоўніца аддзела грамадскага здароўя абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ларыса ЛУЧКО. У студзені кляшчы былі знойдзены пры маніторынгу мясцовасці ў Столінскім раёне, а ў канцы лютага — у Камянцы і пад Брэстам. Прачнуліся як лугавыя, так і лясныя паразіты, пераносчыкі энцэфаліту.

Сёлетняя цёплая зіма паспрыяла кляшчам, таму медыкі яшчэ раз папярэджваюць пра абавязковыя меры бяспекі.

**Яна СВЕТАВА.**

■ Фінансавы выдатнік

# ВЫБІРАЙЦЕ БАНК З РОЗУМАМ

## Аплата праз інтэрнэт — гэта зручна, але паклапаціцеся пра бяспеку

**Мы ўжо некалькі разоў закраналі тэму разлікаў у інтэрнэце, аднак спрэчных і малазразумелых момантаў у гэтай сферы шмат. Вось нядаўна ў рэдакцыю прыйшоў ліст ад нашага чытача: «Я з цікавасцю прачытаў артыкул у газеце ад 3 лютага: «Рукі прэч! Або віртуальны кашалёк...». Пасля гэтага я звярнуўся ў свой банк з просьбай выключыць для маёй аплатнай карткі магчымасць правядзення транзакцый праз інтэрнэт, але мне адказалі, што такую паслугу яны не аказваюць (калі картка не заблакаваная наогул, то яна будзе заўсёды даступная для правядзення транзакцый праз інтэрнэт незалежна ад майго жадання). Хацелася б даведацца: банк, адмаўляючы мне, нічога не парушае?» Падобныя пытанні, зразумела, трэба вырашаць толькі з банкам і ўважліва паглядзець умовы дагавора. Аднак гэты ліст стаў нагодай для размовы з галоўным спецыялістам Галоўнага ўпраўлення развіцця лічбавых банкаўскіх тэхналогій Нацыянальнага банка Вольгай АНТАНОВІЧ.**

***— Ці могуць з дапамогай маёй уласнай плацежнай карткі разлічвацца ў інтэрнэце махляры, якія атрымалі звесткі з яе — нумар, тэрмін дзеяння і гэтак далей, але без ПІН-кода?***

— Пры ажыццяўленні аперацый у сетцы інтэрнэт выкарыстоўваецца не плацежная картка, а пэўныя рэквізіты, якія нанесены на яе. Таму, калі трымальнік аплатнай карткі прадугледзеў у дамове з банкам, што з выкарыстаннем рэквізітаў можна разлічвацца ў інтэрнэце, і калі па тых ці іншых прычынах рэквізіты сталі вядомыя махлярам, магчыма здзяйсненне незаконных аперацый.

***— Якім чынам можна бяспечна карыстацца разлікамі ў інтэрнэце?***

— Пажадана мець асобную картку. Некаторыя банкі для разлікаў у сетцы інтэрнэт замест карткі выдаюць толькі яе рэквізіты, запісаныя на папяровым носьбіце. Калі вы не хочаце заводзіць асобную картку, тады рэкамендуецца ў сістэме інтэрнэт-банк свайго абслуговага банка ўстанаўліваць ліміты па аперацыях у інтэрнэце — абмяжоўваць разлікі без прысутнасці карткі пэўнай сумай, пасля здзяйснення аперацыі аплаты тавару ў сетцы інтэрнэт ставіць забарону на аперацыі без выкарыстання карткі і гэтак далей. Для павелічэння бяспекі разлікаў з выкарыстаннем рэквізітаў плацежнай карткі аплатныя сістэмы распрацавалі праграму 3-D Secure, якая дазваляе зрабіць дадатковую аўтэнтыфікацыю ўладальніка карткі. У міжнароднай аплатнай сістэмы VISA гэтая тэхналогія называецца Verified by Visa (VbV), MasterCard — MasterCard SecureCode (MCC), у American Express — SafeKey. Патэнцыйнаму трымальніку карткі неабходна разумець, што тэхналогія 3-D Secure ў разы павялічвае бяспеку аперацый, што праводзяцца з выкарыстаннем рэквізітаў аплатнай карткі ў інтэрнэце. Таму выбіраць банк-эмітэнт трэба з розумам. У выпадку, калі банк не прадастаўляе магчымасць разлічвацца ў інтэрнэце з выкарыстаннем дадзенай тэхналогіі, а кліент настроены актыўна выкарыстоўваць рэквізіты аплатнай карткі ў глабальнай сетцы, раю разгледзець прапановы іншых банкаў, якія ўкаранілі тэхналогію 3-D Secure.

***— Што ўяўляе сабой дадзеная тэхналогія?***

— Пасля правядзення стандартнай аплаты ў інтэрнэт-краме фарміруецца дадатковы запыт, на які трымальнік карткі павінен адказаць — увесці пэўны код. Недахопы тэхналогіі 3-D Secure: трымальнік можа забыцца на код альбо на этапе яго ўводу адмовіцца ад пакупкі. Таму сёння, калі рынак электроннай камерцыі расце імклівымі тэмпамі, аплатныя сістэмы задумваюцца, з аднаго боку, над спрашчэннем аплаты тавараў, з іншага — над павышэннем бяспекі аплаты. Так, міжнародная аплатная сістэма VISA рыхтуецца да запуску новай праграмы, якая павысіць эфектыўнасць барацьбы з махлярствам у сетцы інтэрнэт. Гэта прынцыпова новы сэрвіс шыфравання звестак (такенізацыя), што будзе ўкаранёны ў сэрвіс анлайн-плацяжоў. Прынцып працы заключаецца ў шыфраванні нумара аплатнай карткі. Пры апрацоўцы транзакцыі 16-значны нумар аплатнай карткі пераўтвараецца ў бессэнсоўны набор знакаў. У такім выглядзе рэквізіты карткі будуць паступаць на сайт інтэрнэт-крамы. Злачынец, які скраў зашыфраваныя нумары (такены) праз кібератаку на інтэрнэт-партал, не зможа выкарыстоўваць іх для доступу да грашовых сродкаў добрасумленнага карыстальніка, таму што сістэмы бяспекі зафіксуюць паўторнае выкарыстанне шыфру і адхіляць пакупку.

***— Што рабіць тым трымальнікам плацежных картак, якія не маюць згаданых тэхналогій, ці калі нехта хоча купіць тавар у інтэрнэт-краме, што не падтрымлівае сістэму бяспекі?***

— Калі інтэрнэт-крама не падтрымлівае тэхналогію 3-D Secure, але ў ёй расплачваецца кліент, чый банк-эмітэнт укараніў у сябе дадзеную тэхналогію і сам трымальнік карткі падпісаўся на яе, тады ў выпадку крадзяжу звестак карткі праз кібератаку матэрыяльную адказнасць за такія аперацыі будзе несці інтэрнэт-крама і, адпаведна, трымальнік карткі верне назад свае скрадзеныя грошы. Менавіта таму вялікая частка вядомых міжнародных інтэрнэт-крамаў падтрымлівае тэхналогію 3-D Secure.

***— Карткі з якімі магчымасцямі і характарыстыкамі найлепш падыходзяць для разлікаў у інтэрнэце?***

— Для разлікаў у сетцы інтэрнэт патрэбна не сама плацежная картка, а яе рэквізіты. Таму плацежная картка можа быць любая, галоўнае, каб у дамове з банкам-эмітэнтам кліент указаў, што з ёй ён плануе разлічвацца ў інтэрнэце.

***— Ці правільна мець некалькі плацежных картак — асобна для звычайных разлікаў, асобна для аплаты тавараў праз інтэрнэт і гэтак далей? Чаму?***

— Безумоўна. Калі ўсе вашы грашовыя сродкі будуць знаходзіцца на адным банкаўскім рахунку і вы будзеце здзяйсняць аперацыі з ёю на тэрыторыі Беларусі, за мяжой і ў сетцы інтэрнэт, рызыка крадзяжу звестак вашай карткі і, адпаведна, вашых грошай з банкаўскага рахунку — досыць вялікая. Таму для разлікаў на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўвайце сваю зарплатную картку, для паездак на адпачынак за мяжу завядзіце іншую, пажадана з рахункам у замежнай валюце, для разлікаў у інтэрнэце выкарыстоўвайце трэцюю. Пасля паездкі за мяжу не паленуйцеся зайсці ў свой інтэрнэт-банк і паставіць забарону на ажыццяўленне любых аперацый з гэтай карткай. Тое ж самае з карткай, прызначанай для разлікаў у сетцы інтэрнэт: пасля здзяйснення паспяховай пакупкі ў інтэрнэт-краме і пры адсутнасці неабходнасці ў найбліжэйшай будучыні выкарыстоўваць рэквізіты гэтай карткі для аплаты проста блакіруйце яе.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ** ■

### Правы не парушаюцца

Рэдакцыя звярнулася з пытаннем нашага чытача да спецыялістаў БЕЛКАРТ. У прэс-службе нам паведамілі наступнае: «Сітуацыя, з якой сутыкнуўся кліент камерцыйнага банка, дапушчальная, калі мінімальныя (базавыя) налады картачнага прадукту прадугледжваюць магчымасць здзяйснення аперацый у сетцы інтэрнэт. Умовы дагавора банкаўскага рахунка з выкарыстаннем банкаўскай плацежнай карткі вызначаюць, ці магчыма змена функцыянальных наладаў.

Калі разглядаць прыведзеную вышэй сітуацыю, якой цікавіцца чытач, то вынікае, што здзяйсненне аперацый у сетцы інтэрнэт уваходзіць у мінімальны функцыянал карткі кліента. Нам здаецца, што ў сувязі з нарастаючай папулярнасцю анлайн-плацяжоў (аплата на інтэрнэт-сайтах) банк чытача газеты загадзя прадугледзеў магчымасць здзяйснення кліентамі такіх аперацый, каб не абмяжоўваць магчымасці трымальнікаў картак, і, адпаведна, гэта фінансавая ўстанова не парушае правы кліента».

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Сталічны час

# МЭТА — ВЫРАСЦІЦЬ ЗДАРОВАЕ ПАКАЛЕННЕ

## Адказвае за гэта не толькі дзяржава, а перадусім — сям'я

**Колькасць шматдзетных сем'яў у Мінску за 2014 год склала больш за 9900, павялічыўшыся ў параўнанні з пазамінулым годам больш як на 12%. Якія захады робіць дзяржава, каб падтрымаць іх і заахвоціць мінчан паляпшаць дэмаграфічную сітуацыю?**

### ЯК АТРЫМАЦЬ СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ?

Па словах **старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкама Жанны РАМАНОВІЧ**, кожнае мінскае дзіця ў той ці іншай ступені карыстаецца дадатковымі мерамі сацыяльнай падтрымкі. Гэта і бясплатнае харчаванне да двух гадоў, і даплаты да кошту харчавання ў навучальных установах, і даплата да поўнага кошту пуцёўкі ў дзіцячыя аздараўленчыя ўстановы асобным катэгорыям, і выплата дапамогі да навучальнага года.

Апроч таго, у адпаведнасці з Указам №572 «Аб дадатковых мерах дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей», што ўступіў у сілу з 1 студзеня, вызначаны разнастайныя спосабы дзяржаўнай дапамогі. Адна з мер — так званы сямейны капітал. Сем'ям пры нараджэнні (усынаўленні) трэцяга і наступных дзяцей прадастаўляюцца безнаяўныя грашовыя сродкі ў эквіваленце 10 000 долараў. Каб атрымаць іх, любы з бацькоў можа звярнуцца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны насельніцтва па месцы жыхарства. Калі заяву задаволяць, у аддзяленні банка будзе адкрыты рахунак. Сямейны капітал можа быць накіраваны на паляпшэнне жыллёвых умоў сям'і, атрыманне паслуг адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны і назапашванне на накапляльную пенсію маці. Але датэрміновае выкарыстанне сродкаў магчыма толькі ў адным выпадку: для аказання медыцынскай дапамогі ў выніку заключэння камісіі, калі такая дапамога не можа быць аказана на тэрыторыі Беларусі. Сямейны капітал можна атрымаць толькі аднойчы на адно дзіця.

Таксама ўказам прадугледжаны выплаты дапамог сем'ям, што выхоўваюць дваіх і больш дзяцей, і дадатковыя пазыкі на будаўніцтва жылля пры выхаванні траіх і больш дзяцей.

### ПРАБЛЕМА ГЕНДАРУ І ГВАЛТУ

Жанна Рамановіч таксама распавяла пра тое, як сталічныя ўлады вырашаюць праблему гвалту ў сям'і. Так, мінскія тэрытарыяльныя цэнтры сацабслугоўвання аказваюць паслугі часовага прытулку для жанчын, якія пацярпелі ад хатняга гвалту, фарміруецца банк звестак па размяшчэнні інфармацыі аб гвалтаўніках. Як лічыць старшыня камітэта, адзін крызісны пакой задавальняе патрэбы ўсяго горада. Апроч таго, у сталіцы працуюць пяць арганізацый, якія таксама прапаноўваюць ахвярам сямейнага гвалту часовы прытулак.

Як паведаміла Жанна Рамановіч, у гэтым месяцы ў Мінску пройдзе інфармацыйна-асветная акцыя «Ты можаш змяніць сітуацыю», прысвечаная супраціву хатняму гвалту.

Адзначаючы, што ахвярамі гвалту ў сям'і найчасцей становяцца жанчыны, старшыня камітэта абвергла меркаванне пра тое, што ў беспрацоўя «жаночы твар».

«Сярэднестатыстычны беспрацоўны — гэта мужчына з агульнай сярэдняй адукацыяй ва ўзросце 39 гадоў. Як правіла, жанчыны цяпер больш мабільныя і матываваныя на пошук працы», — паведаміла Жанна Рамановіч.

Па яе словах, на сталічным рынку працы сёлета назіраўся прыток зваротаў у службу занятасці і рост рэгістрацыі беспрацоўных. Істотна зменшылася колькасць вакансій.

«Калі летась на аднаго беспрацоўнага прыпадала 6-8 свабодных працоўных месцаў, то цяпер на аднаго беспрацоўнага — 1,8 вакансіі».

Як засведчыла старшыня камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама, больш за ўсё жанчын працуе ў фінансавай сферы, адукацыі і ахове здароўя. Па-ранейшаму мала жанчын сярод токараў, слесараў і кіроўцаў, на будаўнічых пляцоўках, але, напрыклад, сярод сталічных кранаўшчыкоў 17% жанчын.

### МЕДЫЦЫНА НЕ ЗАСТАЕЦЦА ЎБАКУ

Вядзецца работа і ў сферы лячэбна-прафілактычнай дапамогі. Дзякуючы ёй у Мінску ў параўнанні з мінулым годам ужо назіраецца павышэнне нараджальнасці на 1,5%, паведаміла **начальнік аддзела лячэбна-прафілактычнай дапамогі дзецям і маці Святлана МАНЫШАВА.** Дае плён і перадабортная псіхалагічная работа ў жаночых кансультацыях — колькасць абортаў знізілася ў параўнанні з 2014 годам на 1%, і гэта толькі пачатак, запэўніла начальнік аддзела.

Сем'і, дзе выхоўваюцца дзеці да трох гадоў, могуць бясплатна атрымліваць медпрэпараты, а пры знаходжанні ў стацыянары разам з дзецьмі да пяці гадоў могуць быць і бацькі. Таксама прадугледжаны розныя праграмы рэабілітацыі дзяцей з інваліднасцю.

Прафілактычная работа праводзіцца ў кабінетах дружалюбнага стаўлення да падлеткаў. Па словах Святланы Манышавай, найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца паслугі гінеколагаў і псіхолагаў. Пры жаданні дзеці могуць прайсці ў цэнтрах медыцынскае абследаванне.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК** ■





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Вікторыя Язерская:

# «Галоўнае, каб быў парадак у душы і ў галаве»

**По адукацыі яна — рэжысёр тэатра, але паколькі на сцэне перспектывы не ўбачыла, то вырашыла шукаць сябе ў іншай сферы — на экране. Як вядучую навін Вікторыю Язерскую ведаюць гледачы розных тэлеканалаў. Яна працавала спачатку на Першым нацыянальным, затым на расійскім LifeNews. А амаль год таму з'явілася ў эфіры «Нашых навін» на тэлеканале АНТ, дзе з нядаўняга часу вядзе яшчэ і праграму «Контуры». Напярэдадні жаночага свята мы вырашылі распытаць тэлевядучую аб прыярытэтах, працы ў кадры і паваротах лёсу...**



***— На тэлебачанні вы амаль пяць гадоў, паспелі ўжо паспрабаваць сябе на розных тэлеканалах. Расцэньваеце гэты перыяд як знакавы ў прафесійным плане?***

— Падчас вучобы ва ўніверсітэце я не мела ўяўлення, чым буду займацца пасля. Бо была ўпэўнена, што з тэатрам ужо дакладна сваё жыццё не звяжу. Мне падабаецца тэатр, аднак я не адчула ў сабе нейкага асаблівага таленту. А на мой погляд, калі гэтага няма і ты не ўпэўнены, што знойдзеш справу па душы, то не варта выходзіць на сцэну. Затым усё склалася класічна: пайшла з сяброўкай на кастынг і трапіла на тэлебачанне. Той вопыт, які набыла за апошнія некалькі гадоў, безумоўна, расцэньваю як значны крок у кар'ерным плане.

**«Мала быць проста маладой і прыгожай, каб цябе ўзялі на тэлебачанне... Я была вельмі заціснутая і павольная. А мне казалі: гэта ж навіны, прачніся, павінны быць дынаміка, драйв!»**

***— Усведамленне таго, што тэлебачанне — ваша стыхія, прыйшло адразу?***

— З тэлебачаннем усё складвалася паступова. Калі толькі прыйшла на пробы, працэс вельмі спадабаўся, хаця атрымліваўцца пачало не адразу. Мая выкладчыца Ірына Маісеева мне не пупскала, мабыць, дзякуючы гэтаму і пачаўся рух... Я прыйшла толькі пасля ўніверсітэта, і маім любімым адзеннем былі джынсы, кеды і футболка. Кожны раз, з'яўляючыся на занятк, я шакіравала Ірыну Генадзьеўну, бо ў яе разуменні на тэлебачанні трэба было выглядаць адпаведна — макіяж, прычоска, адзенне. Хаця цяпер на гэтыя складнікі ўжо менш увагі звяртаюць, асабліва за межамі нашай краіны. Больш важна, што і як ты гаворыш. А перад з'яўленнем у кадры цябе і апрануць, як трэба, і ўкладку зробяць. Я лічу, што мала быць проста маладой і прыгожай, каб цябе ўзялі на тэлебачанне... Я была вельмі заціснутая і павольная. А мне казалі: гэта ж навіны, прачніся, павінны быць дынаміка, драйв! Спатрэбіўся час, каб злавіць рытм, патрэбны ў працы. Дзякуй Белтэлерадыёкампаніі, дзе далі магчымасць зразумець, што мне падыходзіць, і адчуць гэта ў прамым эфіры. Можна ж трэніравацца месяцамі, але нічога не атрымаецца, пакуль не выйдзеш у прамы эфір і не зразумееш: вось зараз на цябе глядзяць, і ты павінна рабіць тое, што патрабуецца. Тады я і навінамі мала цікавілася. А тут трэба было ведаць пра ўсё, таму што калі расказваеш пра тое, чаго не ведаеш, то гэта адчуваецца. Дзякуючы правільнаму падыходу ў навучанні, я зразумела, што і як. І цяпер займацца гэтай справай у мяне, здаецца, нядрэнна атрымліваецца.

***— Чым быў абумоўлены ваш пераезд у Маскву?***

— Адпрацаваўшы амаль два гады на Белтэлерадыёкампаніі, паступова перайшла з ранішніх эфіраў у вячэрнія выпускі «Панарамы». А праз нейкі час са мной звязаліся з тэлеканала LifeNews і прапанавалі прыехаць на пробы. Я, не раздумваючы, вырашыла паехаць і паспрабаваць. Было зусім не важна, як я выглядаю. Іх цікавіла ўнутранае напаўненне і разуменне парадку дня, таму што ўжо на першым праглядзе ў студыі на запісе было прамое ўключэнне з гасцямі, што для мяне стала абсалютна новай практыкай. Праз тыдзень патэлефанавалі, каб паведаміць, што са мной хацелі б супрацоўнічаць. На той момант мяне тут нішто не трымала, таму сабралася і паехала.

***— Спантаннасць — рыса вашага характару?***

— Я цяжкая на пад'ём. Хоць і не надта веру ва ўсялякія гараскопы, але я Шалі, і таму часта заўважаю, што мне вельмі ўласціва сумнявацца. Напрыклад, нават нейкі прадукт у краме магу выбіраць паўгадзіны... Але ў той момант такі выбар і шанц паспрабаваць сябе ў нечым новым я не ўпусціла. Безумоўна, першы час было страшна і складана, а потым уліласся ў калектыў і ўсё наладзілася.

***— Які вопыт вам даў гэты год працы ў камандзе LifeNews?***

— З пазіцыі вопыту за гэты год я перажыла 5—10 гадоў, таму што канал новы і вельмі дынамічны. Эфіры 24 гадзіны на суткі, пастаянна прамыя ўключэнні, госці ў студыі. Парадак дня змяняецца кожную гадзіну: калі нічога не адбываецца, то зробяць навіну з дробязі. І ты павінен усё гэта данесці да гледача. Даводзілася шмат працаваць, чытаць. Разам з тым калегі заўсёды гатовы дапамагчы, ніхто не скажа: «Ты не разумееш, адыдзі». Калі, напрыклад, нешта не атрымліваецца, то цябе не знімуць з эфіру, а наадварот, ты будзеш там і ў працэсе разбярэшся, уцікнеш. Для мяне гэта была каласальная практыка. І цяпер у нашай медыяпрасторы мне значна прасцей працаваць, бо я атрымала жорсткую загартоўку. Бывала, праводзіш у прамым эфіры па чатыры гадзіны: працуеш без суфлёра, толькі планшэт і навушнік, дзе чуеш выпускаючага рэдактара. Пасля выходзіш і нават не арыентуешся, дзе ты. А ў нас на выпуску навін ты нават разагрэцца не паспяваеш. Не хапае драйву, але з «Контурамі» праца стала больш цікавай.

***— У вас пастаянная праца ў «Навінах». Не ўзнікае думкі паэксперыментаваць з фарматам? Ці знаёмы вам стан эмацыйнага выгарання?***

— Я спрабавала сябе на расійскім тэлебачанні на ранішняй праграме. У забаўляльным фармаце мне спадабалася, і атрымлівалася, як мне казалі, няблага. Таму, калі трапіцца магчымасць працаваць у такім напрамку, то з задавальненнем згаджуся. Пакуль мне і без гэтага працы хапае, а з эфірамі на «Контурах» яе прыбавілася. Цяпер і выхадныя занятыя цалкам. Што да выгарання, то, мабыць, яшчэ рана гаварыць пра гэта. Я сустракала шмат прыкладаў таго, што журналісты цынічныя. Страшнае ДТЗ імі ўспрымаецца часам як удача, бо пра гэта можна падрабязна расказаць, як бы тое жахліва ні гучала. У Маскве я была шакіравана такім падыходам, але ў працэсе і сама стала прасцей усё ўспрымаць. Аднак, паколькі я жанчына, то калі даводзіцца распавядаць пра крушэнне самалёта ці нейкую іншую трагедыю, эмоцыі цяжка стрымаць. Страшных рэчаў адбываецца шмат, і ты за ўсё перажываеш і прапускаеш праз сябе. Але, улічваючы, што я не так даўно працую ў гэтай сферы, то яшчэ не магу гаварыць пра нейкую стомленасць.

***— Ці не сумуеце па працы ў Маскве?***

— Там была цудоўная каманда, з аднасінамі, як у сапраўднай сям'і. Усе маладыя і ў большасці сваёй з жаданнем працаваць. Там не маеш часу ні на што акрамя збору навін... Проста лётаеш на працягу ўсяго дня. А ў нас прасцей, бо краіна меншая і падзей не так шмат. Хоць нашы карэспандэнты таксама выкладваюцца напоўніцу.

***— Мяняючы месца працы, наколькі лёгка сыходзіцеся? Ці не складана ўлівацца ў новы калектыў?***

— У кожным выпадку ўсё па-рознаму. У Белтэлерадыёкампанію я прыйшла навічком. Калектыў склаўся задоўга да мяне, маё з'яўленне ўспрымалі насцярожана і з лёгкай раздражнёнасцю. Паступова ўсё склалася: і аднасіны, і працоўная атмасфера. Сыходзіла без шкадавання, мірна. На LifeNews новы быў і тэлеканал, і калектыў, таму ўсе былі на аднолькавай пазіцыі. Камфортна было працаваць, хоць і людзі былі з розным досведам. Напрыклад, можна было падысці да чалавека, які не адзін год адпрацаваў у «Известиях» і задаць яму любое пытанне. Бар'ера ні разу не адчула. З імі было складана развітвацца. Мне і сёння пішуць, каб вярталася. Шмат сяброў там засталося. А з прыходам на АНТ усё досыць спакойна склалася — прыйшла і працую.

***— Вы вярнуліся, бо выйшлі замуж. Абмяркоўвалі варыянт пераезду мужа ў Маскву?***

— Не, Масква — горад для працы, а не для жыцця. А паколькі мы планавалі стварыць сям'ю, то варыянт з пераездам у Маскву нават не разглядалі. Я не хацела б, каб мае дзеці нарадзіліся там і пайшлі ў школу, таму што ў Маскве бывае досыць небяспечна. Кар'ера не вартая таго, каб вось так рызыкаваць, бо не яна ў старасці будзе з табой тэлевізар глядзець і гарбату піць. Так, сумую па працы і па людзях, але не шкадую... Як той казаў, твой чалавек з'яўляецца на гарызонце раз у жыцці, я веру, што гэта ён і ёсць, таму абсалютна шчаслівая. Безумоўна, давялося пераглядзець свае прыярытэты. І цяпер я ведаю, што магу, і маё эга задаволена, час засяродзіцца на іншых рэчах. Бачыла жанчын, адданых працы, але не замужам і без дзяцей. На маю думку, для жанчыны на першым месцы павінны быць сям'я і дзеці. Кожнаму сваё, але я не з тых, каму патрэбна толькі праца.

**«Парадак дня змяняецца кожную гадзіну: калі нічога не адбываецца, то зробяць навіну з дробязі. І ты павінен усё гэта данесці да гледача».**

***— Улічваючы, што для вас сям'я ў прыярытэце, вы з тых жанчын, хто любіць ствараць утульнасць, гатаваць абеды?..***

— Па гаспадарцы мы разам усё робім. Я шмат часу праводжу на працы, але гатую дастаткова часта. Але не магу сказаць, быццам дома ўсё па палічках раскладаю. Калі нешта не ляжыць на месцы, то скандал мы ўчыняць не будзем. Галоўнае каб быў парадак у душы і ў галаве.

***— Хутка 8 Сакавіка. Якое ў вас стаўленне да гэтага свята?***

— Мне пашчасціла ў тым сэнсе, што кожны дзень я адчуваю ўвагу да сябе. І падарункі, і кветкі атрымліваю проста так. Не ведаю, як будзе з часам. Нічога неверагоднага на 8 Сакавіка не чакаю, бо разумею, што гэта будзе такі ж прыемны дзень, як і іншыя побач з каханым мужчынам... Жанчынам, вядома, хочацца калі не кожны дзень, то хоць адзін дзень на год адпачыць, адчуць сябе каханай. Як бы ні ўспрымалі гэтае свята, але жанчыне яно дае магчымасць радавацца, атрымліваць сваю порцыю ўвагі і павагі.

***— Што б пажадалі жанчынам?***

— Жадаю кожнай сустрэць свайго чалавека. Для жанчыны няма нічога больш важнага, чым надзейнае мужчынскае плячо побач. Здароўя жанчынам і іх сем'ям. Тым, у каго ёсць мамы — беражыце іх, цікаўцеся іх жыццём і радуйце. І часцей прызнавайцеся ў любові.

**Алена ДРАПКО.**

---

## Не прапусціце

### Шукаем адказы ў «Што? Дзе? Калі?»

і з «Адваротным адлікам»

**На тэлеканале АНТ гледачоў чакае новы фільм праекта «Адваротны адлік» і вясенні сезон гульні «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Прыхільнікі першага даведаюцца пра «А-229. Сакрэтная зброя Крамля» ад рэжысёра Настассі Міршнічэнкі і аўтара сцэнарыя Наталлі Голубевай. А тэлегледачы, якія «хварэюць» за беларускую каманду знатакоў, змогуць сачыць за вясеннай серыяй гульняў новага сезона, першая з якіх адбудзецца ўжо ў пятніцу (6 сакавіка) у 23:15.**

Прыход вясны для многіх — асаблівая пара, час росквіту і новых пачынанняў. А для знатакоў і тэлегледачоў яна азначае пачатак новага сезона гульняў беларускага тэлевізійнага клуба «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Пачнецца сёмы сезон гульняў каманды Паўла Малецкага, і якраз напярэдадні Міжнароднага дня жанчын. Улічваючы гэта, эфір 6 сакавіка не абыдзецца без сюрпрызаў для гледачоў і прыхільнікаў клуба знатакоў. Асабіста павіншуе дарагіх жанчын таксама і пастаянны вядучы, аўтар праграмы Алесь Мухін. А падчас музычнай паўзы сваім выступленнем парадуе саліст прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» Аляксей Грос. Не прапусціце сустрэчу з любімай праграмай у пятніцу ў эфіры тэлеканала АНТ!

Разгадваць таямніцы гісторыі і расстаўляць новыя акцэнты ў падзеях дзён мінулых запрашаюць і аматараў дакументальнага цыкла «Адваротны адлік». Чарговы фільм носіць назву «А-229. Сакрэтная зброя Крамля» і распавядзе гісторыю пра тое, як у снежні 1930 года на стале кіраўніка знешняй разведкі СССР Станіслава Месінга апынуўся асабліва важны данос. Інфарматары паведамлялі пра вяселле вядомага нямецкага журналіста Арнольда Бронана і актрысы Берлінскага тэатра Вольгі Фёрстэр. Чым гэтая навіна так зацікавіла савецкія спецслужбы? Якія зносіны былі ў маладой пары з разведкай? І як у гэтай гісторыі быў замешаны галоўны ідэолаг нацысцкай партыі Ёзэф Гебельс?

...У пачатку 30-х гадоў у Маскве распрацавалі сакрэтную аперацыю па ўвядзенні ў бліжэйшае акружэнне Гітлера надзейнага інфарматара. Час ішоў, а паведамленняў з Берліна не паступала. Поспех аперацыі ўжо быў пастаўлены пад сумненне, аднак прыйшло паведамленне: «Агент А-229 наладжвае цесную сувязь у нацыянал-сацыялістычных кругах Гебельса»... Хто ж дзейнічаў пад гэтым нумарам, стала вядома толькі ў 1990-х гадах. Аказалася, што гэта была... маладая актрыса Вольга Фёрстэр. Менавіта яна змагла так спадабацца галоўнаму ідэолагу нацысцкай партыі, што той нават зрабіў яе давераным чалавекам. Ад крыніцы А-229 Цэнтр атрымліваў звышкаштоўную інфармацыю аб планах партыі, яе лідарах, моцных і слабых баках.

На мяжы зрыву аперацыя аказалася, калі Гебельс закахаўся ў Магду Берэнд. Сувязь Вольгі і рэйхсміністра магла перарвацца. Тады берлінская рэзідантура распрацавала смелы план: Фёрстэр павінна была выйсці замуж за бліжэйшага сябра Гебельса — Арнольда Бронена, што дазволіла б ёй заставацца сярод людзей, набліжаных да рэйхсміністра.

Яшчэ пяць гадоў жанчына перадавала ў Цэнтр асабліва важную інфармацыю. А аднойчы Гебельс пачаў з ёй дзіўную размову пра пакаранне польскіх агентаў і арышты здраднікаў, выяўленых у МЗС Германіі. У канцы 1935 года ў кватэры аднаго з прэстыжных раёнаў Берліна прагучаў выстрал. Пасля пайшлі чуткі, быццам вядомая актрыса Фёрстэр скончыла жыццё самагубствам.

Сама Вольга вырашыла свой лёс ці так пазбавіліся ад раскрытага агента? Пра гэта вы зможаце даведацца ў панядзелак (9 сакавіка) у новым фільме дакументальнага цыкла «Адваротны адлік» на тэлеканале АНТ.






# Праз прывен з кецкай — да слабага полу

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Мэ́ндлік —** гэта пяць снапоў, пастаўленыя кучкай для прасушкі. «За лесам жытні палетак, устаўлены мэндлікамі без шапак», — чытаем у Рыгора Мурашкі.

**Ке́цка —** мяшэчак для грошай (той жа кашалёк). У Якуба Коласа: «Зараз усе забразгалі кецкамі, дастаючы грошы».

**Прэ́міна —** частка ракі, якая зімой не замярзае. Прэміна роднасная з добра знаёмым нам словам «прамы». Пад націскам адбыўся пераход «а» ў «э».

**Ваќацыі —** перапынак у занятках, які даецца навучэнцам для адпачынку. Слова прыйшло да нас з лацінскай мовы.

**Пры́вен —** частка будынка, праз якую ўваходзяць у жылыя памяшканні. Слова, дарэчы, запазычана з літоўскага дыялекту, дзе прывен — гэта пярэдні пакой, вітальня.

**Атра́мант —** раствор каляровага рэчыва для пісання. Слова прыйшло да нас з лацінскай мовы.

**Як макаў цвет —** так кажуць часцей пра дзяўчат: прыгожая, румяная. Беларускі аналаг — «хоць вады напіся», рускі — «кровь с молоком».

**Слабы пол —** дзяўчаты, жанчыны. Па-беларуску яшчэ скажуць — прыгожы пол, дзявочае племя. Калі жанчыны слабы пол, то мужчыны па ўжо жартоўнай традыцыі лічацца дужым полам.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» кожную суботу ў 11.10—11.25.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ■ Тэлесеткі

# ТРОЕ Ў ЛОДЦЫ І АПЕРЭТА

**«Беларусь 3» павіншуе гледачоў з 8 Сакавіка і з днём нараджэння Андрэя Міронава. У святочную праграму канала ўвайшлі канцэрты «зорак» класічнай і эстраднай музыкі, а таксама выдатныя кінакамедыі.**

Так, у дзённым эфіры ў нядзелю будзе паказаны міжнародны галаканцэрт артыстаў аперэты «Дзеля жанчын, дзеля жанчын...» (Ради женщин, ради женщин...»), а ўвечары меламанаў парадуе сумесны праект тэлевізійнікаў і Палаца культуры Маладзечна — зборны канцэрт папулярных беларускіх артыстаў.

Да дня нараджэння ўлюбёнца многіх жанчын Андрэя Міронава прымеркаваны паказ фільмаў «Трое ў лодцы, калі не лічыць сабаку» і «Саламяны капялюшык», дзе акцёр сыграў галоўныя ролі. Працягнуць лінейку кіно і забяспечаць гледачам цудоўны настрой камедыя Сідні Полака «Тутсі», дзе Дасцін Хофман сыграў адну з найлепшых сваіх роляў, і музычная камедыя Карэна Шахназарава «Мы з джаза» ■

# ПАНЯДЗЕЛАК, 9 САКАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20, 0.35** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.40 Серыял «Дзявочнік».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.45 Трагікамедыя «Гараж».**
**13.50, 15.55 Меладрама «Зноў адзін на ўсіх».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00 Серыял «Дзявочнік».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Форум з Дзмітрыем Бачковым.
**22.45 Серыял «След».**
**1.15** Дзень спорту.
**1.25 Меладрама «Сяброўкі».**

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.05, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.40 Баявік «Кулінар 2».**
**10.35** «Зразумець і абясшкодзіць».
**11.10 Серыял «Ландыш серабрысты».**
**13.15 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**15.40** «Comedy woman».
**17.50, 0.20 Серыял «Віртуозы». 1-я серыя.**
**18.50 Серыял «Інтэрны».**
**19.50** «Хачу ў тэлевізар».
**20.25 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**20.55** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**21.35 Серыял «Косці».**
**23.30 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 16.20, 19.05, 23.30** Калейдаскоп.
**8.10, 17.30** «Дыя@блог P.S.».
**8.40 «Усмешка Моны Лізы». Драма.**
**10.30** «Культпрасвет».
**11.10 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі: «Выклікаем агонь на сябе». Драма. 1—4-я серыі.**
**16.30** «Камертон». Галоўны рэжысёр Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Аляксандр Козак.
**17.00 «Гваздзік». Драма.**
**17.55 «Чараўнік Смарагдавага горада». Фільм-казка.**



**19.15 «Гусарская балада». Камедыя.**
**20.45** «Калыханка».
**21.05** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**21.55** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**22.20** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**22.50** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Артур Шуляк.

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 1.55** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Паўфінал. Другі матч.
**9.55** Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка пераследу. Жанчыны.
**10.55** Баскетбол. НБА. «Кліўленд» — «Фінікс».
**12.45** Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка пераследу. Мужчыны.
**13.45** Вольная барацьба. Гран-пры на прызы А. Мядзведзя.
**15.50** Спартыўная гімнастыка. Кубак свету. Далас.
**18.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**19.25** Хакей. КХЛ. Чвэрцьфінал Заходняй канферэнцыі. Сёмы матч.
**21.45** Час футбола.
**22.30** Змяшаныя адзінаборствы. ММА. М-1 Global.
**1.00** Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00, 11.10 Камедыя «Гусарская балада».**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**12.00, 13.10 Меладрама «Масква слязам не верыць».**
**14.50** Да 35-годдзя фільма. «Масква слязам не верыць». «Нараджэнне легенды».
**16.15 Камедыя «Дзяўчаты».**
**18.20** «Адваротны адлік. «А-229. Сакрэтная зброя Крамля».
**18.50 Камедыя «Справа ў табе».**
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15 Драма «Сховішча».**
**0.20** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.50** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.25** «Такі лёс».
**15.10** «Іншая краіна». «Зямля доўгага белага воблака».
**15.50** «Ежа багоў».
**16.50 «Вовачка 2». Серыял.**
**18.30** «Дакументальны праект»: «Бітва за тронам».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тыдзень спорту».
**23.30 Маст. фільм «Мацярык».**
**1.00** «Дакументальны спецпраект»: «Сакрэты старажытных рэцэптаў».

## МІР

**6.00** М/ф.
**7.50 Маст. фільм «Рымскія канікулы».**
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** Інтэрв'ю Ларысы Галубкінай.
**10.30, 3.35 Маст. фільм «Гусарская балада».**
**12.20, 2.40 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».**
**13.15, 0.15 Маст. фільм «Саламяны капялюшык».**
**16.15 Серыял «Вясковая камедыя».**
**20.15 Маст. фільм «Пяць нявест».**
**22.15 Маст. фільм «Утаймаванне свавольнага».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «У свеце жывёл».
**7.30** «Пакой смеху».
**8.20 Маст. фільм «Мядовы месяц».**
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта».
**12.05** «Сам сабе рэжысёр».
**12.50** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**13.20** «Мая планета».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.20** «Хор Турэцкага. Мужчынскі погляд на каханне».
**15.45, 17.00** «Смяяцца дазваляецца».
**18.05** «Калі спяваюць мужчыны».
**20.35 Маст. фільм «Каралі».**
**22.25, 23.10 Маст. фільм «Познія кветкі».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.15** «Іх норавы».
**6.45** «Судовы дэтэктыў».
**7.50, 8.20** «Справа ўрачоў».
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**9.00, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Ядзім дома».
**14.45** «Пракурорская праверка».
**15.40 Маст. фільм «Чыстая вада ля вытоку».**
**19.30** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**20.20 Серыял «Марскія д'яблы».**
**22.05 Маст. фільм «Тонкая штучка».**
**23.45** «Тры кіты» савецкага спорту» з дакументальнага цыкла «Уласны гонар».

## 8 КАНАЛ

**7.00, 13.30, 19.40, 20.55, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30** «Сёння клюе».
**8.00, 19.45 Серыял «Перавозчык».**
**8.50, 18.30 Серыял «Радзіма».**
**9.45 Серыял «Рабінзон Круза».**
**11.15 Камедыя «Красуня».**
**13.20** «Кінаблакнот».
**13.35 Серыял «Чарцяня».**
**15.15, 19.25** «Хатняя крама».
**16.30** «Золата маўчання» .
**17.00 Серыял «Дарагі доктар».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Фантастыка «Які бяжыць у лабірынце».**
**23.00 Серыял «Новыя прыгоды старой Крысцін».**
**23.30** «Хобі TV».

## ВТБ

**6.00, 4.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 17.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**9.30, 14.10, 23.05** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**10.00, 19.00** Серыял «Маладзёжка 2».
**11.00, 18.00** Серыял «Кухня 4».
**12.00** «Уральскія пельмені».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00** Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
**16.00, 3.00** «Давай развядзёмся!».
**20.00** Сітком «Сямейны бізнес».
**21.10** Меладрама «Як ажаніцца і застацца халастым».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

## КУЛЬТУРА

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Артыстка». Маст. фільм.
**12.10** «Астравы». Аляксандр Абдулаў.
**12.50** Краіна птушак. «Цецеруковы тэатр». Дак. фільм.
**13.30** «Пешшу...». Масква бронзавая.
**14.00** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Вайна на ўсіх адна».
**14.15** «Маці Марыя». Маст. фільм.
**15.45** «Больш, чым каханне». Людміла Касаткіна і Сяргей Коласаў.
**16.25** «Ноч у цырку».
**18.00** «Людзі і манекены». Маст. фільм.
**19.15** Тэатру «Сатырыкон» — 75! Юбілейны вечар.
**20.30** «Песня не развітваецца... 1973 год».
**21.35** Юбілей Ларысы Галубкінай. «Лінія жыцця».
**22.30** Наша новае кіно. «Кококо». Маст. фільм.
**23.55** «Джазавыя вечары ў Кактэбелі». Міжнародны фестываль у Крыме.
**1.25** «Каралеўскі бутэрброд». «Іншы бок». М/ф для дарослых.
**1.40** Краіна птушак. «Цецеруковы тэатр». Дак. фільм.
**2.20** П.І. Чайкоўскі. Серэнада для струннага аркестра.

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 16.30, 19.30, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**6.55, 8.30, 9.55, 11.25, 13.00, 14.35, 16.15, 17.25, 19.00, 20.25, 20.50, 21.40, 23.40, 0.40, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20, 13.20** Юбілейны канцэрт групы «Зямляне». 2008 год.
**9.00** «Быў час». «Мода па-савецку». 2006 год.
**10.30** «Спяем, сябры» з Таццянай Візбар. 2008 год.
**12.00** «Назад у СССР» з Аляксандрам Паліткоўскім. «Самая абаяльная і прывабная». 2007 год.
**15.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Песні святаў». 2005 год.
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Бітлз». 2005 год.
**20.40** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 2004 год.
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**23.00** «Рок-н-рол ТБ». Канцэрт Канстанціна Нікольскага. 1992 год.
**0.00** Дак. фільм «Настальгія па Ташкенце».
**1.20** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1956. 1-я частка. 2008 год.
**4.00** «Колба часу».

## EUROSPORT

**10.30, 15.00** Веласпорт. Парыж — Ніца.
**11.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні.
**12.15** Біятлон. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**13.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**13.45, 18.15, 0.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**18.00** Веласпорт.
**20.00** Футбол. Еўрагалы.
**20.30, 1.45** Футбол. Кубак Алгарве.
**22.30** WATTS.
**23.00** Пра рэслінг.
**1.30** Конны спорт. Скачкі.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.05** Серыял «Месяцовы хлопчык».
**6.50** Камедыя «Помста сяброўак нявесты».
**8.20** Камедыя «Магутныя качаняты».
**10.50** Камедыя «Я і яго былыя».
**12.25** Камедыя «Сямейны план».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (шоу)».
**14.25, 15.15, 21.40, 0.40, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Містар Піткін: Ранняя пташка».
**17.40, 19.45, 22.00** Серыял «Татуля»
**18.10** Камедыя «Як ажаніцца і застацца халастым».
**20.20** Камедыя «Госць».
**23.10** Камедыя «Туз».
**1.15** Камедыя «Святоша».
**3.10** Серыял «Пэт і Кэбедж».
**4.00** Камедыя «Усё ўключана 2».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Доктар І.».
**8.30, 18.50, 2.00** «Эзель». Серыял.
**10.10, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.55, 17.50** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.50, 16.55** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.45** «Апошні забой». Маст. фільм.
**15.30, 22.50** «Зорныя гісторыі».
**16.25** «Нераскрытыя тайны: Факультатыў. Навука».
**20.50** «Блудныя дзеці». Серыял.
**21.50, 1.20** «Пры загадкавых абставінах». Серыял.
**23.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**0.25** «Часова даступны».
**3.40** «Аўрора». Серыял.

## ТБ1000

**6.00** Драма «Скарб».
**7.45** Меладрама «Гульні страсці».
**9.15, 18.05** Меладрама «Аўгуст Раш».
**11.15** Камедыя «50 першых пацалункаў».
**13.00** Мюзікл «У рытме сэрца».
**14.35** Трылер «Крумкач».
**16.30, 1.45** Трылер «Паляўнічы на забойцаў».
**20.00** Трылер «Без кампрамісаў».
**21.45** Меладрама «Закаханыя».
**23.30** Меладрама «Джэйн Эйр».
**4.00** Драма «Касмаполіс».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.40** Фантастыка «Рэжым поўнага апускання».
**8.40** Фантастыка «Цяжка быць богам».
**10.50** Драма «Брэсцкая крэпасць».
**13.20** Драма «Палёты ў сне і наяве».
**15.00** Меладрама «Паралельныя светы».
**16.35** Баявік «Бой з ценем».
**18.45** Камедыя «Нянькі».
**20.20** Фантастыка «Заселены востраў». Фільм першы.
**22.20** Камедыя «Аддамся ў добрыя рукі».
**0.10** Трылер «Стальны матылёк».
**1.55** Меладрама «Прагулка па Парыжы».
**3.20** Драма «Вышыня 89».
**5.10** Камедыя «Свята пад замком».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Займальная навука.
**6.22** Гульня ў лікі.
**6.43, 12.40, 18.44, 22.30, 2.17, 5.15** Зрабі або памры.
**7.28, 13.27** Паядынак неператможных.
**8.13, 21.45, 23.15, 1.32, 4.30** Расследаванні авіякатастроф.
**9.42, 14.12, 19.30** Гісторыя ежы.
**10.27, 14.57, 20.15** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.11** Мегазаводы.
**11.56** Золата Юкана.
**15.43** Дзікая прырода Расіі.
**16.28** Небяспечныя сустрэчы.
**17.13** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**17.59, 21.00, 0.47, 3.02** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**19.06, 22.53, 2.40, 5.37** Навуковыя недарэчнасці.
**0.01** Паранармальнае.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Разбуральнікі легенд.
**9.40, 13.50** У пагоні за класікай.
**12.10, 18.00** Паляўнічыя на склады.
**13.00, 22.10, 6.20** Голыя і напалоханыя.
**14.40, 5.35** Што было далей?
**16.20, 19.40, 4.00** Хуткія і гучныя.
**17.10, 4.45** Махінатары.
**18.50** Мяцежнікі ледзяного возера.
**20.30** Дылетант супраць эксперта.
**23.00** Беар Грылс: выпрабаванне страхам.
**23.50** Гульня на жыццё.
**0.40, 3.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**1.30, 7.10** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Пачатак тыдня будзе напружаным. Ваша пазіцыя хоць і досыць устойлівая, але ўвесь час падвяргаецца праверцы. Магчымыя правакацыі, неабходна распазнаць іх і зрабіць адпаведныя высновы. Не варта лезці на ражон, але і адступаць таксама асабліва няма куды — стойце на сваім. На працягу тыдня большасць праблем вырашыцца. Паляпшэнне фінансавага стану магчыма ў сярэдзіне тыдня, у гэты час чакаюцца грашовыя паступленні, з'яўленне новых магчымасцяў, якія дазволяць прасунуцца далей або знайсці сябе на новай ніве.



**СКАРПІЁН.** З матэрыяльнага пункту гледжання ваша становішча будзе стабільным і ўпэўненым. Вы можаце планаваць справы наперад, але не вельмі захапляйцеся гэтым, бо магчымыя неабдуманыя расходы, асабліва звязаныя з якімі-небудзь кампаніямі або святамі.

Для асабістага жыцця тыдзень будзе паспяховым, магчымае паляпшэнне адносін, асабліва калі яны не перайшлі яшчэ ў стадыю асабліва сур'ёзных. А вось у кантактах з іншымі людзьмі будзе адчувацца напружанне. Магчымыя спрэчкі, асабліва па пытаннях фінансаў.



**СТРАЛЕЦ.** У адносінах надыходзіць вельмі добры перыяд, калі вы будзеце адчуваць прыліў сіл і справы ў гэтым напрамку будуць працякаць досыць імкліва. Паспрабуйце трохі стрымліваць свае жарсці, каб эмоцыі не перайшлі цераз край. Сакрэт поспеху крыецца ў гарманічным стане і спакойных дзеяннях, плаўных і мерных. Вам будзе хацецца паскорыць працэс, дзейнічаць хутчэй, але задача заключаецца ў тым, каб утрымацца ад гэтага і набрацца цярпення. Усё павінна ісці сваёй чаргой.



**КАЗЯРОГ.** Наспявае канфлікт паміж вамі і кімсьці з блізкіх людзей, і пазбегнуць яго, хутчэй за ўсё, ужо не атрымаецца. Але сварка пойдзе вам на карысць, бо дазволіць выказацца і пачаць усё нанова. Калі першая палова тыдня выглядае даволі негатыўна, то бліжэй да яго канца адносіны наладзяцца, а вырашаны канфлікт дазволіць ім развівацца далей. У канцы тыдня могуць узнікнуць новыя яркія пачуцці. Добры час для рамантычнага знаёмства і пабудовы новых адносін. Для вас расчышчана пляцоўка, каб рухацца наперад, не азіраючыся на мінулае.



**ВАДАЛЕЙ.** Паспяховы тыдзень. Будзеце адчуваць сябе на кані. У працы назіраецца стабільны рост і развіццё, можна нават разлічваць на павышэнне або, прынамсі, на пахвалу, што дазволіць адчуваць сябе яшчэ больш упэўнена і строіць планы на будучыню. У хатніх справах таксама ўсё добра, у норме працякаюць справы і клопаты, нішто не выходзіць з графіка, а ў адносінах пануе гармонія і паразуменне. Рэкамендуецца развіваць раней запланаваныя справы, пераводзіць іх у актыўную фазу.



**РЫБЫ.** На вас пасыплюцца праблемы і клопаты з усіх бакоў, і вырашаць іх давядзецца самастойна. Узваліць свае цяжкасці на кагосьці іншага не атрымаецца, як і проста ігнараваць іх, спадзеючыся, што вырашыцца ўсё само сабой. Нагадаюць пра сябе даўнія хвасты, прычым не самым прыемным чынам і зусім недарэчы. Магчыма, давядзецца ад чагосьці адмовіцца, чымсьці ахвяраваць і ад чагосьці пазбавіцца, толькі тады агрэхі мінулага закрыюцца і вы зможаце рухацца далей. Калі вы прыкладзяце намаганні, то да канца тыдня многае ўжо вырашыцца.

# ЧАЦВЕР, 12 САКАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.15, 22.05 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Дзявочнік».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Цуд».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.05 Баявік «Залатая пастка».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.50** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00** Тэлебарометр.
**9.05, 16.45 Баявік «Кулінар 2».**
**10.10** Беларуская кухня.
**10.45, 21.35 Серыял «Косці».**
**11.45** «Разбуральнікі міфаў».
**12.50** Ікра.
**13.25 Фантастыка «Блізкія кантакты трэцяга роду».**
**15.50** Перазагрузка.
**17.55 Серыял «Віртуозы».**
**18.55** Хачу ў тэлевізар!
**19.10** Біятлон. Чэмпіянат свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны.
**20.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. «Вольфсбург» — «Інтэр». У перапынку: 21.45 «Спортлато 6 з 49» .
**21.50** «КЕНО».
**23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. «Фіярэнціна» — «Рома».
**1.00 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.55, 19.35, 0.10** Калейдаскоп.
**8.10, 16.50 «Падлетак». Драма. 1-я серыя.**
**9.25 «Я — актрыса». Драма.**
**11.00, 18.05** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**11.30, 19.45, 21.05 «Нататкі Піквікскага клуба». Драма.**
**13.25, 23.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Паўла Дубашынскага.
**14.05** «Сустрэчы ў Букваедзе». Леанід Парфёнаў.
**15.05 «Кола». Кароткаметражны фільм.**
**15.25** «Свет дзіўных сноў, як манускрыпт». Дак. фільм.
**15.55** «Наперад у мінулае».
**16.20 «Гваздзік». Драма.**
**18.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**19.05** «Сіла веры».
**20.45** Калыханка.
**22.05** «Дыя@блог». «Пра вечнае».
**22.30 «З каханымі не расставайцеся». Меладрама.**

## БЕЛАРУСЬ 5

**3.05, 12.15** Баскетбол. НБА. «Аклахома Сіці» — «Кліперс».
**5.15** Тэніс. Турнір ВТА. Індыян-Уэлс.
**7.15** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд матчаў у адказ 1/8 фіналу.
**8.30** Біятлон. Чэмпіянат свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны.
**10.30** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Паўфінал. Трэці матч.
**14.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Баварыя» — «Шахцёр».
**16.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Чэлсі» — ПСЖ.
**17.55** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**18.25** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Паўфінал. Чацвёрты матч.
**20.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. 1-ы матч. «Днепр» — «Аякс».
**23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. 1-ы матч. «Наполі» — «Дынама» (М).
**1.00** Тэніс. Турнір ВТА. Індыян-Уэлс.
**4.35** Баскетбол. НБА. «Сан-Антоніа» — «Кліўленд».

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Доўгі шлях дадому».**
**23.00 Серыял «Анёл або дэман».**
**23.55** «Вячэрні Ургант».
**0.30** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Бландзінка з амбіцыямі».**
**10.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50 «Ніна». Серыял.**
**15.45** «Ежа багоў».
**16.50 «Вовачка 2». Серыял.**
**18.30** «Вам і не снілася»: «Паляванне на «Чырвоную смерць». 3-я частка.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Баявік «Ямакасі: самураі нашых дзён».**
**22.00** «Глядзець усім!».
**23.00** «Тайны свету».
**23.55** «Аўтапанарама».
**0.15 «Ніна». Серыял.**

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Як справы?».
**9.30, 1.20 Маст. фільм «Салёны сабака».**
**11.00 Серыял «Вясковая камедыя».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 2.45 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».**
**14.15 Серыял «Жыццё, якога не было».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20, 3.40 Серыял «Неспакойны ўчастак».**
**19.25 Маст. фільм «Не спрабуйце зразумець жанчыну».**
**21.10, 23.15 Серыял «Жураў».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**0.35** «Культпрасвет».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**11.50** «Адэса. Героі падземнай крэпасці».
**12.50 Серыял «Каменская».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Асаблівы выпадак».
**18.00 Серыял «Люба. Любоў».**
**18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.55** «Адэса. Героі падземнай крэпасці».
**21.55, 23.10 Серыял «Погляд з вечнасці».**
**0.00** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.05** «Справа ўрачоў».
**9.00, 10.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45, 22.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.05** «Пракурорская праверка».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**17.55** «Усё будзе добра!».
**19.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**20.45, 23.20 Серыял «Марскія д'яблы».**
**22.45** «Анатомія дня».

## 8 КАНАЛ

**7.00, 13.30, 19.40, 20.55, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.40, 19.45 Серыял «Перавозчык».**
**8.30, 18.25 Серыял «Радзіма».**
**10.00 Серыял «Мерлін».**
**10.50, 23.30** «Хобі TV».
**11.20 Драма «Жыццё іншых».**
**13.40 Серыял «Чарцяня».**
**15.15, 19.25** «Хатняя крама».
**16.35** «МакаShow».
**16.50 Серыял «Дарагі доктар».**
**19.25** «Фэшн is my прафэшн».
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Трылер «Небяспечная ілюзія».**
**23.00 Серыял «Новыя прыгоды старой Крысцін».**

## ВТБ

**6.00, 4.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 17.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 20.00** Сітком «Сямейны бізнес».
**10.00, 19.00** Серыял «Маладзёжка 2».
**11.00, 18.00** Серыял «Кухня 4».
**12.00** Трылер «Пагоня».
**14.00, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00, 1.00** Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
**16.00, 3.00** «Давай развядзёмся!».
**21.10** Меладрама «Страшна прыгожы».
**0.00** «Дурні і дарогі».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** «Беспасажніца». Маст. фільм.
**12.45** Расія, любоў мая!
**13.10, 20.50** «Тысячагадовая гісторыя Перу». Дак. фільм.
**14.05, 1.55** «Пецярбургскія тайны». Серыял.
**15.10** «Гутаркі пра рускую культуру». «Мастацтва — гэта мы».
**15.55** «Сапраўдны Леанарда». Дак. фільм.
**17.25** Прысвячэнне Дэбюсі. Сімфанічны аркестр Лільскай оперы.
**18.20, 2.50** «Арман Жан дзю Плесі дэ Рышэльe». Дак. фільм.
**18.30** «Захаваны час». Дак. серыял.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.10** «Правілы жыцця».
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**21.45** «Магічны крышталь Жарэса Алфёрава». Дак. серыял.
**22.10** «Культурная рэвалюцыя».
**22.55** «Віктар Папкоў. Суровы анёл». Дак. фільм.
**0.00** Стваральніку легендарнай праграмы «А» Сяргею Анціпаву прысвячаецца...
**0.55** «Імпрэсіянізм і мода». Дак. фільм.
**1.50** «Эзоп». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.
**7.00, 8.20, 8.45, 9.40, 11.55, 12.40, 14.10, 14.40, 15.40, 17.50, 19.25, 20.35, 20.50, 21.40, 23.30, 1.00, 2.30, 2.50, 3.40, 5.40** Музычная настальгія.
**7.30** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**8.30** «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы». 2005 год.
**9.00, 15.00, 19.40, 21.00, 1.30, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 13.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».
**11.00** Дак. фільм «Іншаземец».
**12.00** «Акулы пяра». Кабарэ-дуэт «Акадэмія». 1995 год.
**14.30, 2.40** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 2004 год.
**17.00** «Я сама». Тэма: «Маладая жанчына шукае працу». 1995 год.
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Новая хваля ў савецкім року 80-х». 2005 год.
**20.45** «Прэс-экспрэс».1993 год.
**23.00** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Бітлз». 2005 год.
**5.00** «Рок-н-рол ТБ». Канцэрт Канстанціна Нікольскага. 1992 год.

## EUROSPORT

**10.30, 22.45** Веласпорт. Парыж — Ніца.
**11.30, 14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**12.00, 15.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**12.45, 21.00, 0.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**14.00** Зімовыя віды спорту. Скі-пас.
**15.45, 18.15** Лыжнае двайбор'е. Кубак свету.
**16.45** Веласпорт.
**19.00, 23.45, 2.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**1.30** Тэніс. «Матс пойнт».

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40** Серыял «Татуля».
**6.35** Камедыя «Як ажаніцца і застацца халастым».
**8.10** Камедыя «Госць».
**10.40** Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».
**12.35** Камедыя «Зануда».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (шоу)».
**14.25, 15.15, 21.40, 0.50, 2.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Ізноўгуд, або Каліф на гадзіну».
**17.40, 19.50, 22.00** Серыял «Вялікая школа».
**18.10** Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
**20.20** Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі».
**23.10** Меладрама «Па той бок».
**1.15** Камедыя «Туз».
**3.10** Серыял «Месяцовы хлопчык».
**4.00** Камедыя «Містар Піткін: Ранняя пташка».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.15** «Доктар I.».
**7.45, 18.50, 2.00** «Эзель». Серыял.
**9.30, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.15, 17.40** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.05, 16.45** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.00, 20.45** «Блудныя дзеці». Серыял.
**13.55** «Простыя складанасці».
**14.25, 0.25** «Каменская». Серыял.
**15.20, 22.45** «Зорныя гісторыі».
**16.15** «Нераскрытыя тайны: Факультатыў. Навука».
**21.45, 1.10** «Пры загадкавых абставінах». Серыял.
**23.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.40** «Аўрора». Серыял.

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Паляўнічы».
**7.45, 16.00** Меладрама «Аўгуст Раш».
**9.45** Драма «Буш».
**12.00** Драма «Некалькі добрых хлопцаў».
**14.15** Драма «Скарб».
**18.00** Камедыя «Каханне на кончыках пальцаў».
**20.00, 3.30** Драма «Полак».
**22.00** Меладрама «Даю год».
**23.45** Трагікамедыя «Жыццё цудоўнае».
**1.30** Меладрама «Жорсткія гульні».

## ТБ1000

**6.20** Казка «Казка. Ёсць».
**8.10** Драма «Выкупленне».
**10.20** Казка «Прынцэса на гарошыне».
**11.50** Драма «Старэйшая жонка».
**13.30** Трагікамедыя «Баламут».
**15.05** Фантастыка «Рэжым поўнага апускання».
**17.00** Меладрама «Прагулка па Парыжы».
**18.30** Камедыя «Аддамся ў добрыя рукі».
**20.20** Камедыя «Нянькі».
**22.00** Фантастыка «Заселены востраў». Фільм першы.
**0.00** Драма «Русалка».
**1.50** Фантастыка «Цяжка быць богам».
**4.20** Драма «Бедны, бедны Павел».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Займальная навука.
**6.22** Гульня ў лікі.
**6.43, 12.40, 18.44, 21.45, 1.30, 4.30** Зрабі або памры.
**7.28, 8.57, 13.27, 19.06, 5.37** Навуковыя недарэчнасці.
**7.50** Гульні розуму.
**8.13** Кіраванне натоўпам.
**9.42, 19.30** Машыны.
**10.27, 14.57, 20.15** Паядынак непераможных.
**11.11** Мегазаводы.
**11.56** Золата Юкана.
**14.12** Шаша праз пекла.
**15.43** Дзікая прырода Расіі.
**16.28** Небяспечныя сустрэчы.
**17.13** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**17.59** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**21.00, 0.47, 3.46** Экстрэмальнае падарожжа.
**22.31, 2.17** Дзённік Ганны Франк.
**0.01** Паранармальнае.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.40, 13.50** Пятая перадача.
**12.10, 18.00** Багажныя войны.
**13.00, 22.10, 6.20** Аляска: сям'я з лесу.
**14.40, 5.35** Навука магіі.
**16.20, 19.40, 4.00** Мотарэстаўрацыя.
**17.10, 4.45** Вялікі махінатар.
**18.50** Склады.
**19.40** Бітва за нерухомасць.
**20.30** Паляўнічыя на рэліквіі.
**20.55** Паляўнічыя на рэліквіі — ламбард.
**22.10** Залатая ліхаманка.
**23.50** Брыстальскі заліў.
**0.40, 3.10** Адпетыя рыэлтары.
**1.30, 7.10** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

Гісторыя вучыць

# ГАРАДСКІ АРХІЎ... ЗДАЛА Ў ЛАМБАРД

## Сумленныя і адказныя чыноўнікі ва ўсе часы былі на вагу золата

**На жаль, улада спакушае, і некаторыя, заняўшы «цёплае месца», пачынаюць думаць пра свае асабістыя выгоды больш, чым пра дзяржаўныя. Максім МАКАРАЎ, кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік унітарнага прадпрыемства «Навукова-тэхналагічны парк БНТУ «Палітэхнік» правёў цікавае даследаванне: якімі былі ўлады мінулага, а канкрэтна — у Полацку.**

Вядома, што менавіта ў Полацку нараджалася беларуская дзяржаўнасць. Таму вынікі даследавання ўяўляюць асаблівы інтарэс. А нядаўна ў Смаленску была надрукавана кніга «Месцкія ўлады Полацка (1580 — 1772 гг.): арганізацыя, персанальны склад.» Карэспандэнт «Звязды» папрасіў аўтара расказаць пра некаторыя факты з дзейнасці мясцовай улады мінулага.


Фота Іны КАЛЕЧЫЦ.

Аўтограф, верагодна, будучага лаўніка Максіма Андрэевіча Казловіча: «Maximus Kozlowski A. D. 1640». Спаса-Праабражэнская царква (Полацк), паўднёвая грань паўднёва-ўсходняга слупа.

### ЯК УДАВА РАСПАРАДЗІЛАСЯ КНІГАМІ

Беларускія праваахоўныя органы актыўна змагаюцца з карупцыяй, СМІ паведамляюць пра гучныя крымінальныя справы. Было нямала ахвотнікаў выкарыстаць службовае месца ва ўласных мэтах і ў старадаўнія часы.

— У прыватнасці, гучныя скандалы былі звязаны з імем бурмістра Даніэля Міхновіча. У 1660 годзе полацкі магістрат атрымаў ад царскіх ваявод распараджэнне набыць у ваколіцах Вільні збожжа і даставіць яго ў лагер войскаў Івана Хаванскага пад Ляхавічы. З гэтай мэтай магістратам на захад ВКЛ былі высланы мяшчане Стафан Гаўрыловіч і Стафан Крывіцкі, што везлі з сабой 300 рублёў «срэбнымі маскоўскімі капейкамі». Па дарозе яны даведаліся, што армія Хаванскага разбітая, выслалі грошы назад у Полацк, на рукі Даніэля Міхновіча. Апошні на той момант з'яўляўся гадавым райцам (чыноўнікам сярэдняга звяна ўлады). На гэтым ва ўмовах ваеннай неразбярыхі сляды згаданых 300 рублёў былі згублены. Канчаткова даказаць, што іх прысвоіў менавіта Міхновіч, удалося толькі ў 1676 годзе. Па падліках магістрата і мяшчан, што былі агучаны 20 студзеня 1672 года, ён як райца маскоўскага перыяду праўлення Полацкам так і не разлічыўся з горадам, — расказвае Максім Макараў.

**Часцей за ўсё магчымасць трапіць на першую прыступку службовай лесвіцы і распачаць кар'еру ў магістраце мелі дзеці і зяці тых, хто ўжо займаў пасады бурмістраў і райцаў.**

Дарэчы, у сакавіку 1676 года кнігі магістрата захоўваліся ў гарадской канцылярыі, што размяшчалася ў доме пісара Тэадора Ельяшэвіча. 23 мая 1676 года Ельяшэвіч памёр. А ўжо 20 чэрвеня ўраднікі магістрата скардзіліся на яго ўдаву за тое, што яна на працягу доўгага часу не аддае райцам так званыя «гарадскія кнігі»... Жанчына апраўдвалася тым, што па прычыне цяжкага матэрыяльнага становішча здала архіў у ламбард. І прасіла магістрат аказаць ёй грашовую дапамогу, каб выкупіць дакументы.

### УЛАДА ЯК СЯМЕЙНЫ БІЗНЕС

У гісторыі Полацка, якую даследаваў Максім Макараў, таксама меў месца амаль камічны па сваіх наступствах выпадак.

— Вясной 1676 года намеснік лантвойта (аднаго з кіраўнікоў улады самакіравання) і бурмістр Мікалай Зелядніцкі на час сваёй адсутнасці перадаў паўнамоцтвы зяцю Яну Пяшкевічу. Апошні адчуў смак падвойнай улады і, нягледзячы на тое, што быў гадавым райцам, увогуле перастаў з'яўляцца на пасяджэнні сесіі магістрата. Ён пачаў аднаасобна разглядаць усе судовыя справы — у тым ліку тыя, што выходзілі за межы кампетэнцыі суда лантвойта — у доме свайго цесця. Цярпенне гарадскіх ураднікаў скончылася, калі Ян Пяшкевіч наважыўся ў пісьмовай форме выклікаць у «свой суд» полацкага райцу Стафана Курбатовіча. 4 мая 1676 года сумеснымі намаганнямі ўсіх трох сесій магістрата супрацьзаконныя дзеянні Пяшкевіча былі спынены, а сам ён таксама часова адхілены ад выканання абавязкаў райцы. Актыўнасць Яна Пяшкевіча ў значнай ступені стала прычынай таго, што 5 жніўня 1676 года яго цесць Мікалай Зелядніцкі быў пазбаўлены пасады намесніка лантвойта, — працягвае даследчык.

Паводле яго слоў, сістэма, у рамках якой члены судовай калегіі — лаўнікі — не выбіраліся, а прызначаліся магістратам, дазваляла вузкаму колу багатых і ўплывовых мяшчанскіх родаў засяродзіць у сваіх руках амаль манапольны доступ да гарадскіх урадаў.

Часцей за ўсё магчымасць трапіць на першую прыступку службовай лесвіцы і распачаць кар'еру ў магістраце мелі дзеці і зяці тых, хто ўжо займаў пасады бурмістраў і райцаў. Калі апошнія выбіраліся, то лаўнікі прызначаліся. І, можна і так сказаць, гэта даводзіла да абсурду дэмакратычнасць пры запаўненні адказных пасад.

— Дзякуючы гэтаму некаторыя сем'і палачан — Алавяшкі, Варонічы, Другавіны і іншыя — на працягу некалькіх пакаленняў утрымлівалі пад сваім кантролем ключавыя пасады гарадской адміністрацыі. Раскажу пра канкрэтныя прыклады, якія сведчаць пра наяўнасць цесных роднасных і шлюбных сувязяў паміж ураднікамі полацкага магістрата. Бурмістр Давыд Парфёнавіч Спіхальскі быў жанаты з дачкой бурмістра Яна Тэрлікоўскага Ганнай. Усе яго дзеці таксама займалі высокі сацыяльны статус: сын Цімафей стаў бурмістрам, сын Філіп — райцам, дачка Настасся — жонкай бурмістра Андрэя Касабуцкага, Еўдакія — жонкай бурмістра Яна Размысловіча, Зоф'я — жонкай лаўніка Яна Другавіны. Амаль стагоддзе займалі пасады ў магістраце прадстаўнікі роду Курбатовічаў. Лаўнік Спірыд Курбатовіч быў жанаты з дачкой райцы Сяргея Савіча Ваўка. Яго сын Стафан стаў бурмістрам, а дачка Тэадора выйшла замуж за вышэй памянёнага бурмістра Даніэля Міхновіча. Дзеці Стафана Курбатовіча таксама зрабілі кар'еры гарадскіх ураднікаў: Давыд стаў лаўнікам, а Габрыэль — райцам. У ратушы засядалі тры пакаленні Лянчыцкіх. Цімафей Гапонавіч Лянчыцкі з'яўляўся лаўнікам. Яго сыны — Абрам, Мікалай і Ян (зяць бурмістра Базыля Свянціцкага) — сталі бурмістрамі.

А ў некаторых выпадках спробы прасоўвання сваякоў на пасады мясцовых ураднікаў насілі нават не «сваяцкі», а чыста карупцыйны характар. Напрыклад, у 1671 годзе бурмістр Даніэль Міхновіч прапанаваў магістрату, які сутыкнуўся з вострым недахопам грошай, аплаціць некаторыя мясцовыя выдаткі з уласнай кішэні. Але пры ўмове, што... яго швагер Курбатовіч будзе абраны райцам. Невядома, чым дакладна скончылася гэтая справа...

### ХТО ТАКІЯ ШАФАРЫ?

У Полацку пасада шафара (кіраўнік службы па ўліку гарадскіх сродкаў) не лічылася прэстыжнай, а разглядалася як цяжкі і адказны абавязак. Існаваў звычай, згодна з якім кожны полацкі мешчанін павінен быў адзін раз у жыцці выканаць шафарскую павіннасць. Пасля чаго ён пажыццёва вызваляўся ад яе.

Калі чалавек не жадаў выконваць абавязкі шафара, ён мог замяніцца іншай асобай або ўвогуле адкупіцца ад службы праз унясенне пэўнай сумы ў гарадскую казну. Водкуп ад шафарства быў у Полацку распаўсюджанай з'явай. Асабліва масавымі ўцёкі ад гэтай павіннасці сталі ў гады Паўночнай вайны 1700—1721 гадоў, калі горад знаходзіўся ў выключна цяжкім эканамічным становішчы. І, зразумела, ніхто не жадаў браць на сябе адказнасць за фінансавыя справы.

Частай з'явай у паўсядзённым жыцці Полацка XVII стагоддзя былі скандалы і судовыя працэсы, звязаныя з фінансавымі злоўжываннямі гарадскіх ураднікаў.

Як расказаў Максім Макараў, 17 сакавіка 1650 года лаўнік Лоранс Згурскі, які напрыканцы 1649 года часова замяшчаў хворага бурмістра Каспара Глаўбіча і асабіста ўдзельнічаў у падліках рэшты месцкіх фінансаў, абвінаваціў ураднікаў леташняй сесіі бурмістра Івана Скабіча, райцаў Фёдара Размысловіча і Сяргея Каменку ў прысваенні 600 коп. Капа — адзінка фінансавых сродкаў, роўная 60 грошам, капа грошаў — 60 грошаў). Цікава, што Размысловіч, які прысутнічаў у ратушы, не стаў рашуча адмаўляць словы Згурскага, але паведаміў апошняму: «Tego nigdy nie dokazesz» (ты гэтага ніколі не дакажаш). 8 красавіка 1650 года ўжо бурмістр Каспар Глаўбіч таксама абвінаваціў іншых ураднікаў сесіі 1649 г. у прысваенні 50 коп гарадскіх грошаў...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

**Кніга, аўтарам якой з'яўляецца Максім Макараў, складаецца з трох асноўных частак, якія цесна звязаны паміж сабой. Першая — гэта нарыс, у якім разгледжаны пытанні арганізацыі і функцыянавання мясцовых улад Полацка ў канцы XVI — трэцяй чвэрці XVIII стагоддзяў. Другая — тэматычныя спісы гарадскіх ураднікаў і дапаможнага персаналу полацкага магістрата (па асобных галінах улады ў храналагічным парадку). Ёсць і «Алфавітны спіс асоб, звязаных з дзейнасцю ўлад Полацка» (усяго ўлічана 315 чалавек, на многіх складзены кароткія біяграмы).**

**Сярод іншага ўяўляюць вялікі інтарэс фотаздымкі аўтографаў афіцыйных асоб, якія яны пакінулі... на сцяне келлі прападобнай Еўфрасінні. Яшчэ адзін прадстаўнік улады «пакінуў след у гісторыі» ў Спаса-Праабражэнскай царкве. Тое, што ў нас час лічыцца прыкметай дрэннага выхавання, аказваецца, з'яўляецца сапраўдным скарбам для гісторыкаў...**

Неасабісты суб'ектыў

# ВЯЛІКІЯ ДЗЕТКІ

## Пятая запаведзь у сучасным прачытанні



НЯДАЎНА давялося ўпершыню пабыць панятой. Справа, скажу асабліва цікаўным, не вельмі прыемная, калі раптам у кватэру звоніць ветлівы аператыўнік і запрашае пабыць сведкай пры вобыску ў суседзяў. Прычым менавіта ў тых суседзяў, з якімі не толькі вітаешся, не ведаючы нават імя, але і перакінешся нейкімі навінамі, і пацікавішся, як жыццё. Зрэшты, не так шмат я пра іх і ведала — толькі што жонка працуе ў банку, муж мае свой невялікі бізнес, а сын летась скончыў школу і недзе вучыцца далей. Добрапрыстойная сям'я, якая жыве ў згодзе і дастатку.

Праўда, з-за каго ў іх хаце міліцыя, доўга думаць не трэба было. У малодшага суседа пад дзвярыма часта збіралася даволі падазроная з выгляду кампанія гэткіх самых маладых і здаровых хлопцаў і пары вісклівых худзенькіх дзяўчат. «Не можа быць, каб яны ў што крымінальнае не ўбіліся», — думалася пра тое не раз. Не памылілася. Зайшоўшы ў адчыненыя дзверы кватэры, убачыла зніякавелы твар бацькі і ўдавана абыякавы — сына. Аператыўнікаў да іх прывялі наркотыкі. «Накурыўся адзін гэтай дрэні, ледзь у бальніцы адратавалі. Пачалі вывучаць, адкуль ён наркату ўзяў, — выйшлі праз сацыяльныя сеткі на вашага суседа», — тлумачыў міліцыянер, надзейна запакоўваючы сістэмнік ад камп'ютара, які забралі пры вобыску.

Гаспадар камп'ютара спакойна, нават з выклікам хадзіў па пакоях, нешта жаваў на хаду. Бацька стаяў ля сцяны спалатнелы, увесь час спрабуючы дазваніцца да жонкі, якая была недзе ў дарозе. На твары былі роспач, збянтэжанасць і — сорам... Прайшло ўжо амаль два месяцы, хлопца дома так і няма — сядзіць пад следствам. Звычайна такія добразычлівыя і ўсмешлівыя, яго бацькі пры сустрэчы апускаюць вочы і спяшаюцца хутчэй прайсці міма. Я іх разумею. У іх двайное гора — адзінае дзіця трапіла ў бяду, а пра гэту бяду асабліва і не раскажаш, бо сорамна.

КОЛЬКІ іх сёння, такіх няшчасных бацькоў! Не выпівох, не гуляк — прыстойных, законапаслухмяных, чые дарослыя дзеці трапляюць у пераплёты, на якія з мігалкамі выязджаюць экстранныя службы. Прычым трапляюць з-за ўласнай дурноты — з-за алкаголю, наркотыкаў, з-за жадання пакуражыцца, адчуць сябе гаспадаром жыцця, здабыць лёгкія грошы. Як той сямнаццацігадовы ў Брэсце, які, адсвяткаваўшы 23 лютага, пырнуў нажом суседа, калі той зрабіў яму заўвагу. Ці як дваццацігадовы, што п'яны зваліўся пад таварняк ля Фаніпаля. Ці як адурманеныя спайсам, што выходзяць у акно дзявятага паверха, бы на ганак. Ці як тыя, хто, седзячы дома ля камп'ютара, гэты спайс прадае...

Праблема выхавання ў сям'і? Магчыма. І справа тут, мяркую, не толькі ў тым, наколькі ўдаецца нам словамі і ўласнымі справамі навучыць нашых дзяцей асновам прадмета «Што такое добра і што такое дрэнна». Мы, здаецца, у апошнія некалькі дзесяцігоддзяў не вучым яшчэ аднаму вельмі важнаму прадмету: любіць самых дарагіх людзей — бацькоў. Не той сляпой інстыктыўнай любоўю, што з першых дзён: калі мама — гэта ежа, а бацька — абарона (а крыху пазней яшчэ і грошы). Любоўю чалавечай, асэнсаванай, калі ўсе свае ўчынкі ты мераеш на тое, каб чалавеку, якога ты любіш, не было дрэнна, балюча, сорамна.

І гэта зусім не значыць, што трэба кожную раніцу пачынаць з чытання пятай біблейскай запаведзі — эфект будзе хутчэй адваротны. Але перастаць для дзіцяці быць ежай ці кашальком, а стаць асобай, вартай павагі, — вось галоўнае. Быць не «продкам», не «радаком», якія ўсё жыццё нешта свайму «атожылку» павінны. Складана? Яшчэ як. Нашмат складаней, чым апрануць, накарміць, вывучыць. Але — трэба. Жыццёва неабходна. Каб не ўбачыць аднойчы пустыя абыякавыя вочы дарослага чужога чалавека. Каб не ўнікаць сустрэчы з суседзямі. Каб не адказваць на спачуванні навакольных — на першы погляд, шчырыя, але з падтэкстам. Каб не курчыцца па начах ад роспачы і безвыходнага «калі б...»

БО мы ж не зможам, як тая каўказская жанчына, сын якой, ажаніўшыся з нашай дзяўчынай, застаўся ў Беларусі. Для хлопца з горнага аула тут было шмат спакус. Ні маладая жонка, ні сын-нашчадак, які хутка нарадзіўся, не стрымалі ад выпіўкі, ад іншых жанчын. Скончылася ўсё страшна — яго з палюбоўніцай у касцюмах Адама і Евы дасталі з дна возера. Экспертыза паказала, што абое былі нецвярозыя.

Маці, якая прыехала на пахаванне за блізкі свет, заходзілася ад плачу. Роўна да той хвіліны, пакуль ёй не расказалі, пры якіх абставінах сын загінуў. Выпрасталася, пагардліва зірнула на труну і адмовілася забіраць яе дадому. «Закапайце, дзе хочаце, — сказала. — Ён зняславіў увесь род, зняславіў мяне. Я з такой ганьбай вяртацца не буду». — «Гэта ж твой сын», — спрабавалі ўшчуваць яе нашы жаласлівыя кабеты. «Які ён мне сын? Калі ён п'яны лез у возера з палюбоўніцай, ён пра мяне не думаў»... Так і паехала — з каменным тварам і гордай спінай.

А ён застаўся ляжаць у чужой зямлі. Непрыкаяная душа, якой не даравалі за нелюбоў.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■ Наўздагон

# ЗАБАЎЛЯНКІ ДЛЯ ЯНКІ

## У Віцебску пад дахам дома дарэвалюцыйнай пабудовы Віні Пых загаварыў па-беларуску

**Месца правядзення чарговага мерапрыемства ў рамках праекта «Забаўлянкі для Янкі» было насамрэч незвычайным — паддашак, дзе знаходзіцца творчы бітлз-клуб «Чердачок». Дарэчы, уваход на беларускамоўнае свята быў без квіткоў. У госці да «Янкі» прыйшлі як прыхільнікі беларускай мовы, так і тыя, што проста паважаюць гісторыю і культуру, мову сваёй краіны.**

Энтузіясты дапамагаюць ахвотным стаць бліжэй да мовы, традыцый беларусаў. Арганізоўцца майстар-класы, сустрэчы з творчымі людзьмі, чытаюцца зусім не сумныя і вельмі карысныя «лекцыі»... Таму многія з гасцей свята прыемна здзівіліся. Аказваецца, вывучаць мову зусім нескладана, калі дапамагаюць носьбіты мовы. Апошнія даказалі, што яна можа спатрэбіцца, каб... ажаніцца або выйсці замуж, знайсці добрую працу. Ды мала яшчэ для чаго...

У насычанай праграме беларускамоўнай акцыі адбылася і віктарына. Ведаючы геаграфію і гісторыю, можна было атрымаць прызы. Напрыклад, вы памятаеце, які савецкі бард беларускага паходжання? Дзіўна, што мала хто можа згадаць Высоцкага. Дарэчы, аўтар гэтых радкоў быў адзіным на свяце, хто адразу даў правільны адказ. І ў якасці «слана» мне ўручылі дыск з мульцікам на беларускай мове. А як прыемна было дзятве прачытаць вершык на мове і атрымаць за гэта падарунак.

Прыемным сюрпрызам стаў прагляд дыяфільма для самых маленькіх, які агучваў Віталь Броўка, дырэктар канцэртнага агенцтва «Кастусь-медыя». Сучасныя дзеці, ды і моладзь, наўрад ці калісьці бачылі дыяфільмы... І наўрад ці цяпер дарослыя людзі, якія ў дзяцінстве з інтарэсам іх глядзелі, бачылі беларускамоўныя!

Падчас цудоўнай гульнявой праграмы дзеці трапілі ў казку і сталі ўдзельнікамі шоу мыльных пузыроў... Маглі і бясплатна сфатаграфавацца на памяць у імправізаваным нацыянальным фотасалоне.

А напрыканцы праграмы, якая працягвалася каля трох гадзін, быў прадэманстраваны мульцік «Віні Пых». Зразумела, яго героі размаўлялі па-беларуску. І бачылі б вы, як захоплена глядзелі маляваны фільм дзеці.

Гарбата і смачныя пачастункі ад мясцовага вытворцы салодкай прадукцыі — прадпрыемства «Віцьба» — стваралі амаль што хатнюю абстаноўку.

Падчас мерапрыемства добраахвотнікі маглі ахвяраваць грошы на ўсталяванне помніка народнаму паэту Беларусі Рыгору Барадуліну. Арганізатары праекта «Забаўлянкі для Янкі» ў размове з карэспандэнтам «Звязды» адзначылі, што іх падтрымліваюць выбітныя асобы горада, арганізацыі і проста цікавыя і таленавітыя людзі! Запланаваны шэраг новых сюрпрызаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Мытня

# ШТО ЗА «ЗБОРНЫ ГРУЗ»?

**У рэспубліканскім пункце мытнага афармлення «Беняконі» спынілі аўтамабіль з таварам «зборны груз».**

У ходзе агляду супрацоўнікі аддзела па барацьбе з кантрабандай і адміністрацыйнымі мытнымі правапарушэннямі высветлілі, што ў грузавым адсеку фуры перавозчыка ажно 628 квадратных метраў паркетнай дошкі. Кошт тавару, які не заяўляўся ў суправаджальных дакументах, папярэдне ацэнены больш чым у 700 мільёнаў беларускіх рублёў, паведамляе прэс-група Ашмянскай мытні. Па гэтым факце распачалі адміністрацыйны працэс.

* * *

**Супрацоўнікі пункта мытнага афармлення «Маладзечна» Мінскай рэгіянальнай мытні спынілі спробу незаконнага ўвозу на тэрыторыю ЕАЭС тавару вядомай гандлёвай маркі на суму больш за 400 мільёнаў рублёў.**

Тавар «Груз зборны» — сантэхнічныя змяшальнікі і іх часткі — прыбыў з Літвы. Згодна з суправаджальнымі дакументамі, прад'яўленымі мытнаму органу, прадаўцом выступала вядомая іспанская кампанія. Падчас агляду тавару былі знойдзены арыгінальныя суправаджальныя дакументы, з якіх вынікала, што ён быў прададзены на кошце, які больш чым у два разы перавышаў заяўлены. Груз канфіскаваны ў якасці меры забеспячэння адміністрацыйнага працэсу.

**Барыс ПРАКОПЧЫК, Сяргей РАСОЛЬКА**


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | **Лот № 1. Одноэтажный бревенчатый жилой дом, общей площадью 50,2 кв.м с земельным участком площадью 0, 2500 га с кадастровым № 220887024601000014, стоимостью 372 960 000 рублей.** |
| Собственник (владелец) имущества | Лютько Николай Николаевич |
| Местонахождение (адрес) имущества | д. Красногорка Браславского района |
| Информация об обременениях | Земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000 В, площадь 0.0106 га. Земли, находящиеся в водоохранных зонах и прибрежных полосах водоемов, площадью 0,2500 га |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Витебская обл., г. Браслав, ул. Красноармейская, д. 8, каб. 15 25 марта 2015 года в 10.00 |
| Справочная информация | Отдел принудительного исполнения Браславского района, 211970, Витебская обл., г. Браслав, ул. Красноармейская, д. 8. Начальник отдела – Чернявский Иван Никодимович, тел. 80215362585. |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Браславского района № 3642903000074 в РКЦ №205 в г. Браслав филиала №214 в г. Новополоцк ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801660, УНП 300002505, **не позднее 16.00 24.03.2015 г.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии со ст.486 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ (ООО «Стройметгута»)

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | **ЛОТ № 1 – грузовой специальный автокран МАЗ 6303, регистрационный номер 0277 FI-2, кузов Y3M6303A3C0002760, 2012 г.в., с крановой установкой КС-55727 стоимость 736 400 000 рублей.** |
| Собственник (владелец) имущества | ООО «Стройметгута» |
| Местонахождение имущества | Поставский р-н, д. Гута ул. Заводская, д. 1 |
| Информация об обременениях | Автокран не снят с регистрационного учёта |
| Место, дата и время проведения торгов | Витебская обл., г. Поставы, ул. Советская, 76а, каб. 13, 18.03.2015 года в 11.00 |
| Справочная информация | Судебный исполнитель отдела принудительного исполнения Хведевич Е.И., тел. 8-02155-20-937, Витебская обл., г. Поставы, ул. Советская, 76а, каб. 13 |
| Условия и порядок | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения транспортного средства, предусмотренных законодательством. 2. Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен не позднее 17.03.2015 на депозитный счет Отдела принудительного исполнения Поставского района р/с 3642903000168 в ЦБУ №230 г. Поставы, ф-ла 216 АСБ Беларусбанк г. Полоцк МФО 648, УНН 300302938. 3. Минимальная величина первого шага составляет 5 процентов стоимости реализуемого с торгов имущества (лота). 4. В соответствии со статьей 385 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**по объекту «12-этажный жилой дом со встроенными помещениями № 31 (по генплану) в микрорайоне Малиновка-6. Встроенные помещения»,** ***опубликованной в газете «Звязда» № 81 за 03.05.2014, № 14 от 24.01.2015***

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад», доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменения в проектные декларации, опубликованные в газете «Звязда» № 81 (27691) от 03.05.2014, № 14 от 24.01.2015.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договору создания объекта долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается:**

- **1 (одна) однокомнатная квартира** общей площадью 46,48 кв.м на 1-ом этаже жилого дома стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 100 долларов США** по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты.

Документы для заключения договора будут приниматься с **11.03.2015**.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие настоящей.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20, к. 2, тел.: (017)200-06-85, (044)795-44-44.

УНП 192400611

Открытое акционерное общество

## «Пивзавод Оливария»,

*220029, г. Минск, ул. Киселева, дом 30*

**ОАО «Пивзавод Оливария» ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Пивзавод Оливария», которое состоится 27 марта 2015 года в 10 час. 00 мин. в помещении выставочного зала ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, ул. Киселева, дом 30.**

Форма проведения годового Общего собрания акционеров – **очная**.

**Повестка дня годового Общего собрания акционеров:**

1) Итоги финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Пивзавод Оливария» за 2014 г.
2) Отчет Наблюдательного совета о работе в 2014 г.
3) Отчет Ревизионной комиссии о работе в 2014 г.
4) Заключение Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности ОАО "Пивзавод Оливария" за 2014 г.
5) О результатах аудиторской проверки. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков ОАО «Пивзавод Оливария» за 2014 год.
6) Утверждение результатов распределения прибыли и убытков ОАО «Пивзавод Оливария», выплата дивидендов по итогам работы за 2014 г, определение срока выплаты дивидендов за 2014 г.
7) Избрание членов Наблюдательного совета.
8) Избрание членов Ревизионной комиссии.
9) Определение размера вознаграждения и компенсации членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии ОАО «Пивзавод Оливария».
10) Предоставление безвозмездной (спонсорской) помощи.
11) Одобрение сделок, в совершении которых имеется заинтересованность аффилированных лиц.

Список лиц, имеющих право на участие в годовом Общем собрании акционеров 27 марта 2015 года, составлен на основании реестра акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» по состоянию на 06 марта 2015 г.

Материалы к годовому Общему собранию акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 27 марта 2015 года по вопросам повестки дня будут представлены для ознакомления акционерам года на информационных стендах:

- в административном здании ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, проспект Машерова, дом 19, в рабочие дни в период с 20 по 26 марта 2015 г. с 9.00 до 18.00;
- в помещении проходной ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, ул. Киселева, дом 30, в рабочие дни в период с 20 по 26 марта 2015 г. с 9.00 до 18.00;
- в день проведения собрания по месту его проведения.

Регистрация акционеров для участия в годовом Общем собрании акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» будет осуществляться 27 марта 2015 года с 9.00 до 9.50 в помещении выставочного зала ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, ул. Киселева, дом 30.

Регистрация проводится при предъявлении документа, подтверждающего полномочия на участие в собрании (доверенность) и/или паспорта.

УНП 100128525 *Наблюдательный совет ОАО «Пивзавод Оливария»*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 17 марта 2015 года ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| Наименование, характеристики продаваемого имущества, сведения о земельном участке | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Незавершенное законсервированное «здание корпуса №2» готовностью 58 процентов и общей площадью 20354,4 кв.м, инвентарный номер (регистр.) 700/U-83233; расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000002005878 площадью 4,2069 га** | г. Могилев, ул. Крупской, 232 | 16 771 812 000 | 1 000 000 000 |

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **17 марта 2015 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 06.03.2015 по 12.03.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул.К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);**
**(017)217-21-03, (0222) 243-592 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).**

Открытое акционерное общество

## «Дорожно-строительный трест № 3»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,**
**которое состоится 17 марта 2015 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О распределении чистой прибыли и начислении дивидендов за IV квартал 2014 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться **17.03.2015 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — **02.03.2015 г.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

*Справки по телефонам: 28 40 20, 23 64 87 — Отдел правовой и кадровой работы, Наблюдательный совет.*

УНП 700049607

# ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНЫЕ ДЕКЛАРАЦИИ

**по объекту «Группа многоэтажных жилых домов со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по пр. Дзержинского в микрорайоне «Малиновка-1». Жилой дом № 4 по генплану со встроенно-пристроенными помещениями»,**
***опубликованные в газете «Звязда» № 159 от 23.08.2014, № 22 от 05.02.2015.***

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений и дополнений в проектные декларации по объекту «Группа многоэтажных жилых домов со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по пр. Дзержинского в микрорайоне «Малиновка-1». Жилой дом №4 по генплану со встроенно-пристроенными помещениями», опубликованные в газете «Звязда» № 159 от 23.08.2014, № 22 от 05.02.2015.

**Дополнительно для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для физических и юридических лиц предлагаются:**

**- помещение административно-торгового назначения между осями 7-9, А-Е общей площадью 125,27 кв.м стоимостью 2400 долларов США за 1 кв.м с НДС;**

**- помещение административно-торгового назначения между осями 14-16, А-Е общей площадью 72,48 кв.м стоимостью 2400 долларов США за 1 кв.м с НДС;**

**- помещение административно-торгового назначения между осями 30-32, А-Е общей площадью 73,33 кв.м стоимостью 2400 долларов США за 1 кв.м с НДС;**

**- кафе между осями 32-35, А-Е общей площадью 190,26 кв.м стоимостью 2200 долларов США за 1 кв.м с НДС.**

Документы для заключения договоров будут приниматься с **11.03.2015 по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20.** Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие настоящей.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20, каб. 2, тел. (017) 200-06-85, (044) 795-44-44.

УНП 192400611

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственного предприятия**

## «УКС Фрунзенского района г. Минска»

**Застройщик** – Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 27.02.2014 г. в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный, пер., 64а.

Тел./факс 204-67-99, 256-64-18, 399-53-94.

**Режим работы** – 8.45 – 18.00, обед 13.00 – 14.00; пятница 8.45 – 16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Объект «Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланкавыд» по ул. Я. Мавра, 32А» (1-й пусковой комплекс – 2-секционный жилой дом (21–23-этажные секции №№ 3, 4), 2-й пусковой комплекс – 2-секционный жилой дом (17–21-этажные секции №№ 1, 2) и товарищество собственников, 3-й пусковой комплекс – 2-секционный жилой дом (17–19-этажные секции №№ 5, 6).

**1-й пусковой комплекс:**

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, **8 трехкомнатых квартир** (№ 264 площадью 92,3 кв. метра; №№ 245, 257, 265 площадью 92,4 кв. метра; №№ 240, 256, 260 площадью 92,5 кв. метра; № 225 площадью 92,7 кв. метра).

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации составляет при строительстве трехкомнатной квартиры – 15 872 000 белорусских рублей.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию 1-го пускового комплекса – июль 2015 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 101, тел.: 399-53-94, 399-53-91.

**2-й пусковой комплекс:**

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, **11 трехкомнатых квартир** (№№ 272, 276, 280, 296, 300 площадью 101,1 кв. метра; №№ 360, 364, 368 площадью 93,9 кв. метра; №№ 376, 380, 388 площадью 93,7 кв. метра).

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации составляет при строительстве трехкомнатной квартиры – 15 866 000 белорусских рублей.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию 2-го пускового комплекса – июль 2015 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 102., тел. 256-64-18.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем заключается договор;
- оплата 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 3 (трех) банковских дней с даты получения договора.

С момента опубликования настоящей декларации предложения, указанные в предыдущих декларациях, считаются утратившими силу.

Указанная в настоящей проектной декларации цена 1 кв. метра общей площади квартир и их количество считаются действительными до момента опубликования новой декларации.

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении 31 марта 2015 года торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение, продаваемого имущества)** | - капитальное строение с инвентарным номером 614/С-25044, площадью 229,4 кв.м (наименование: садовый домик; назначение: садовый домик), расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»;<br>- земельный участок с кадастровым номером 624883000020000062, площадью 0,0640 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»;<br>- земельный участок с кадастровым номером 624883000020000063, площадью 0,0488 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники». |
| **Начальная цена** | 491 454 650 белорусский рублей |
| **Сумма задатка** | 49 000 000 белорусских рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **31 марта 2015 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 09.03.2015 по 26.03.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

# ЗАО «Топзапэлектро»

Учетный номер плательщика: **100896485**
Вид экономической деятельности: **строительство**
Организационно-правовая форма: **частная**
Орган управления: **без ведомственной подчиненности**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 25**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС 1 января 2015 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2014 года | На 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 48 185 | 49 863 |
| Нематериальные активы | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 173 720 | 30 141 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 5 | 5 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **221 910** | **80 009** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 94 713 | 14 570 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 3 418 | 2 747 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 865 | 264 |
| готовая продукция и товары | 214 | 90 430 | 11 559 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 869 | 4 915 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 31 | 29 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 1 620 | 2 300 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 641 | 463 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 3 | 3 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **97 877** | **22 280** |
| **БАЛАНС** | **300** | **319 787** | **102 289** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2014 года | На 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 5 | 5 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 20 885 | 20 990 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 61 833 | 37 977 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **82 723** | **58 972** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 147 027 | 17 821 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 2 | 1 |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **147 029** | **17 822** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 12 279 | 2 750 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 77 756 | 22 745 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 12 932 | 6 442 |
| по авансам полученным | 632 | 852 | 291 |
| по налогам и сборам | 633 | 2 238 | 3 350 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 733 | 450 |
| по оплате труда | 635 | 2 451 | 1 186 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 5 277 | 6 976 |
| прочим кредиторам | 638 | 53 273 | 4 050 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **90 035** | **25 495** |
| **БАЛАНС** | **700** | **319 787** | **102 289** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2014 года | За январь–декабрь 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 151 545 | 74 857 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (113 131) | (46 471) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 38 414 | 28 386 |
| Управленческие расходы | 040 | (7 069) | (4 190) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 31 345 | 24 196 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 2 236 | 195 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (3 600) | (8 594) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 29 981 | 15 797 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 661 | 36 994 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 324 | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 335 | 857 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 2 | 36 137 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (384) | (24 626) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (382) | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (2) | (24 626) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | - | - |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | - | - |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (1 050) | (587) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (1 050) | (587) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | - | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130) | 140 | (773) | 11 781 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140) | 150 | 29 208 | 27 578 |
| Налог на прибыль | 160 | (5 453) | (6 102) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (2) | (1) |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200) | 210 | 23 753 | 21 475 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | (2 228) |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | 23 753 | 19 247 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

**Руководитель** **В.Н.Косило**

**Главный бухгалтер** **М.Л.Гришилова**

# ВЯСНОВЫ МАТЫЎ



**Па гарызанталі:** **2.** Ганаровая ўзнагарода, якую атрымлівае на ўрачыстай цырымоніі пераможца конкурсу «Міс Сусвету». **7.** Стройнасць, прыгажосць жаночай постаці. **8.** Рускі празаік, аўтар «Аповесці пра першае каханне». **9.** Праслаўленая гімнастка, абсалютная алімпійская чэмпіёнка Марына Лобач як спартыўны настаўнік. **10.** Гераіня аперэты Р. Суруса «Несцерка». **13.** Від біятлонных спаборніцтваў, дзе лідарам у беларускай камандзе з'яўляецца Д. Домрачава. **15.** Касмічнае захапленне доктара медыцыны амерыканкі М. Седан. **18.** Замужняя жанчына. **20.** Расійскі скульптар, творца статуі «Зоя Касмадзям'янская». **25.** Папулярная ўкраінская эстрадная спявачка. **26.** Доўгая жаночая сукенка для язды на конях. **28.** Дзеючая асоба вадэвіля Я. Купалы «Прымакі». **29.** Імя беларускай паэткі Цёткі. **32.** Навука, што прынесла сусветную вядомасць Соф'і Кавалеўскай. **33.** Персанаж трагедыі У. Шэкспіра «Гамлет», увасоблены на беларускай сцэне К. Фадзеевай. **34.** Жанр апавядальнага твора А. Упіта «Жанчына». **35.** Душэўны настрой, выкліканы святочнай урачыстасцю.

**Па вертыкалі:** **2.** Беларуская паэтка, з 1993 года — прэзідэнт жаночага фонду св. Еўфрасінні Полацкай. **3.** Гераіня купалаўскай «Паўлінкі», каларытны вобраз якой на сцэне стварыла народная артыстка Беларусі В. Пола. **4.** Распаўсюджаны ў мінулым музычны апарат для прайгравання пласцінак з гукавым запісам. **5.** Украінскі кампазітар, чыя опера «Наталка Палтаўка» набыла велізарную папулярнасць. **6.** Кардонная рамка для малюнкаў, фотакартак. **11.** Праслаўленая беларуская тэнісістка. **12.** Германская дзяячка, ініцыятар святкавання Міжнароднага жаночага дня. **14.** Пірожнае з заварнога цеста з крэмам. **16.** Вайсковы статус рускай пісьменніцы Надзеі Дуравай. **17.** Шарсцяная каляровая пража для вязання, вышывання. **21.** Вядомы кінарэжысёр, пастаноўшчык фільма «Дзяўчына без адраса». **22.** Жаночая вопратка ў выглядзе свабоднай доўгай сукенкі без рукавоў з засцёжкай. **23.** П'еса З. Бядулі, у прэм'ернай пастаноўцы якой у 1937 г. галоўныя ролі выконвалі І. Ждановіч, В. Галіна. **24.** Учынак, які здзейсніла гераіня Л. Ржэцкай у фільме «Гадзіннік спыніўся апоўначы». **27.** Транспарт, што змайстравала фея для Папялушкі з гарбуза. **30.** Адна з багінь славянскага дахрысціянскага пантэона. **31.** Вялікі гармонік са складанай сістэмай ладоў.

**Па дугах:**
**1.** Лозунг, з якім у 1913 годзе выйшлі на першае святкаванне Міжнароднага жаночага дня дэманстранты Пецярбурга. **2.** Густое кіслае малако.

**Склаў Іосіф КАРПЫЗА,**
*г. Ляхавічы.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:**
**2.** Карона. **7.** Грацыя. **8.** Атараў. **9.** Трэнер. **10.** Насця. **13.** Гонка. **15.** Астранаўтыка. **18.** Дама. **20.** Маніэр. **25.** Ратару. **26.** Амазонка. **28.** Паланея. **29.** Алаіза. **32.** Матэматыка. **33.** Афелія. **34.** Раман. **35.** Стан.
**Па вертыкалі:**
**2.** Коўтун. **3.** Агата. **4.** Патэфон. **5.** Лысенка. **6.** Паспарту. **11.** Азаранка. **12.** Цэткін. **14.** Эклер. 16. Кавалерыст. **17.** Гарус. **21.** Разанаў. **22.** Сарафан. **23.** «Салавей». **24.** Подзвіг. **27.** Карэта. **30.** Лада. **31.** Баян.
**Па дугах:**
**1.** Транспарант. **2.** Прастакваша.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.47 | 18.55 | 11.08 |
| Віцебск — | 7.38 | 18.44 | 11.06 |
| Магілёў — | 7.38 | 18.45 | 11.07 |
| Гомель — | 7.33 | 18.44 | 11.11 |
| Гродна — | 8.02 | 19.11 | 11.09 |
| Брэст — | 8.01 | 19.13 | 11.12 |

**Месяц**
*Поўня 5 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

**Імяніны**
***Пр.*** *Аляксандра, Георгія, Данілы, Цімафея.*
***К.*** *Клаўдзіі, Ружы, Эльвіры, Віктара.*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ЗАЎТРА




## Азбука народнай культуры

### ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

**В**ЕРАЦЯНО — прылада для ручнога прадзення і ткацтва — у народнай культуры ўсходніх славян аб'ядноўвалі з такімі паняццямі, як кручэнне і вастрыё. Яно сімвалізавала жаночы пачатак і жаночыя заняткі.

◈ Так, каб «перадаць» толькі што народжанай дзяўчынцы навыкі прадзення і ткацтва, каб яна была працавітай, пупавіну ёй перарazалі на верацяне.

◈ Верацяно ў шэрагу іншых вострых рэчаў выступала абярэгам ад нячыстай сілы: яго клалі ў калыску дзіцяці ці вешалі пры галаве.

◈ У той жа час існавала строгая забарона даваць верацяно ў рукі дзіцяці. Лічылася, калі дзіця ўколецца аб верацяно, то спыніцца ў росце ці будзе расці ўшыркі, як павялічваецца ад колькасці нітак верацяно.

◈ На працягу года існаваў шэраг абмежаванняў на выкарыстанне верацяна. Так паўсюдна існавала забарона прасці ў пятніцу.

◈ Каб перасцерагчы хатнюю жывёлу ад хвароб, а людзей ад сустрэчы са змеямі, перад вялікімі святамі з хаты выносілі прылады ткацтва. Асабліва гэта тычылася калядных святкаванняў і Благавешчання.

◈ Да Раства трэба было абавязкова схаваць верацяно, прычым на яго неабходна было накруціць паболей нітак, каб наступны год быў такім жа «поўным», спрыяльным.

◈ На Палессі казалі: «Тое верацяно, якое на свята застанецца ў хаце, пойдзе ў лёс змяёй». Згодна са старажытным паданнем, змяя-вераценніца з'явілася на зямлі таму, што жанчыны парушалі забарону і ткалі на святкі.

◈ У засушлівыя дні з дапамогай верацяна на Палессі выклікалі дождж, апускаючы яго ў ваду.

Даты | Падзеі | Людзі

**6 САКАВІКА**

**1475** год — нарадзіўся Мікеланджэла Буанароці, італьянскі скульптар, мастак, паэт. Ён лічыў сваім прызваннем жывапіс. Але аднойчы, убачыўшы збор антычных скульптур у садах Медычы, Буанароці захапіўся скульптурай. Яго «Давід», «Майсей» і «П'ета» — самыя вядомыя скульптуры ў свеце. Аднак непераўзыдзеным тварэннем майстра да гэтага часу застаецца роспіс плафона Сікстынскай капэлы ў Ватыкане. Гэта вялікая па аб'ёме праца — амаль 600 квадратных метраў. Больш за чатыры гады працаваў Мікеланджэла, уласнаручна выконваючы ўсе роспісы. Кожная яго карціна — закончаны твор і адначасова частка адзінага цэлага. Пасля смерці майстра выйшлі ў свет яго паэтычныя творы. Яны дапамаглі паўней зразумець унутраны свет выдатнага творцы, яго стаўленне да веры і мастацтва.



**1927** год — нарадзіўся Габрыель Гарсія Маркес — славуты сучасны пісьменнік, журналіст, выдавец, майстар лацінаамерыканскай і сусветнай прозы XX стагоддзя. Ён стварыў новы літаратурны жанр — магічны рэалізм. Славу і прызнанне яму прынёс раман «Сто гадоў адзіноты», які называюць энцыклапедыяй чалавечага жыцця і кахання. Бо ва ўсіх яго творах адлюстроўваюцца асноўныя канфлікты нашага часу і напружаны пошук магчымых спосабаў іх вырашэння.

**1945** год — нарадзіўся (вёска Хвастовічы Глускага раёна) Уладзімір Сцяпанавіч Муха, беларускі вучоны ў галіне інфарматыкі і аўтаматычнага кіравання, доктар тэхнічных навук, прафесар. У 1967 годзе скончыў Мінскі радыётэхнічны інстытут. З 1968-га — у Беларускім універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Аўтар навуковых прац па сістэмах і метадах апрацоўкі інфармацыі і аўтаматычнага кіравання.

### Было сказана

**Уладзімір Марук, пісьменнік, перакладчык:**
*«І на светлай душы нават светлыя плямы відаць».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Раней казалі: «Лепш сініца ў руцэ, чым журавель у небе».**

**Цяпер кажуць: «Лепш муж у ложку, чым прыгажунчык у сацыяльнай сетцы!».**

Урачэбная памылка — гэта калі хворы паправіўся хутчэй, чым расплаціўся.

**— Люба, калі ты падзелішся са мной сакрэтам гэтага пірага, я ўчыню са праўдную рэвалюцыю ў цэментнай прамысловасці!**

Калі ў бары да вас прыстае дзяўчына, не варта думаць, як ёй ветліва адмовіць. Скажыце проста: "Я тут з мамай".

**— Пажадай мне што-небудзь прыемнае на ноч.**
**— Прыемнага апетыту.**

Адэса, Прывоз. Па радах ходзіць мужчына з паперкай.
— Мужчына, вы забыліся купіць цыбулю!
— Але ў мяне цыбуля не запісана.
— Дык ідзіце, я вам дапішу!





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.


Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.


http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by


Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.


Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.030. Індэкс 63850. Зак. № 791.
Нумар падпісаны ў 19.30 5 сакавіка 2015 года.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |